ШАНЦУЕ ВЁСЦЫ! КАЛІ...

ЛЮДЗІ З ІНВАЛІДНАСЦЮ МОГУЦЬ ШМАТ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 ЛІСТАПАДА 2024 г.
СЕРАДА
№ 226 (30360)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

КАРАТКА

- **«Белпошта» прапанавала навагоднюю калекцыю паштовых набораў.**
- У Беларусі за дзесяць месяцаў пабудавалі 30,4 тысячы кватэр.
- **Мінлясгас: восеньскі план па стварэнні лясных культур выкананы.**
- Вярхоўны Суд Беларусі пачаў разгляд справы Канстанціна Смоўскага па фактах генацыду.
- **З 19 да 22 лістапада МУС праводзіць камандна-штабныя вучэнні на тэрыторыі Беларусі.**
- Юніёрская зборная Беларусі па футболе пераможна завяршыла кваліфікацыю ЧЕ.
- **Гідралагічны заказнік «Астравы Дулебы» пераўтвораны ў рэспубліканскі.**
- Рашэннем Мінгарвыканкама ўстаноўлены індэкс росту кошту будаўніцтва жылля для індэксацыі імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» ў памеры 38,683.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей КУШНАРЭНКА, міністр энергетыкі:

«Усяго за 2019 год — верасень 2024 года ў энергазабеспячальныя арганізацыі паступіла больш як 128 тысяч зваротаў грамадзян аб выдачы тэхнічных умоў на далучэнне электраўстановак аднакватэрных жылых дамоў да электрычных сетак у мэтах выкарыстання электрычнай энергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння. За 10 месяцаў 2024 года тэхумовы выдадзены больш чым 25 тысячам абанентаў, гэта на 30 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД НІКОМУ НЕ ПАВІНЕН ПЕРАШКАДЖАЦЬ ПРАЦАВАЦЬ, НЕ ПАВІНЕН ЦІСНУЦЬ НА ІНШЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ»

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка як Старшыня Усебеларускага народнага сходу правёў пасяджэнне Прэзідыума УНС — вышэйшага канстытуцыйнага прадстаўнічага органа народаўладдзя. Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу з'яўляецца пастаянна дзеючым калегіяльным органам, які забяспечвае аператыўнае вырашэнне пытанняў, што ўваходзяць у кампетэнцыю УНС. Максімальная колькасць членаў Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу складае 15 чалавек. СТАР. 2–3

Маладзёжны вектар

ЗАМАЦАВАЦЦА НА ЗЯМЛІ

Як зацікавіць маладых спецыялістаў?

Пытанне замацавання кадраў у сельскай мясцовасці стаіць на кантролі ў кіраўніка дзяржавы і было ўзнята зноў на «Дажынках» у Полацку. Прэзідэнт зазначыў, што трэба вярнуць моладзь у вёску і далучыць яе да вырашэння інавацыйных задач, забяспечыць умовы для гэтага і даваць магчымасць праявіць сябе. Таму неабходны сучасныя аграгарадкі, пасёлкі, добрае жыллё. Трэба забяспечыць гаспадаркі тэхнікай, арганізаваць годныя ўмовы працы і, вядома, даць нармальны заробак. Таксама кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным распрацаваць стандартны сацыяльны пакет для маладых спецыялістаў, якія будуць працаваць у вёсцы.

Замацаванню кадраў у нашай краіне сапраўды надаецца вялікая ўвага, аднак не ўсе маладыя застаюцца жыць і працаваць у вёсцы. Чаму так адбываецца? Як замацаваць кадры? А можа, на самай справе не так і многа тых, хто з'язджае пасля адпрацоўкі? Адказаць на гэтыя і іншыя пытанні мы папрасілі **начальніка Галоўнага ўпраўлення адукацыі, навукі і кадравай палітыкі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіміра САМСАНОВІЧА.** СТАР. 5

«НЕ ПРАПАЛЬВАЙ СВАЁ ЖЫЦЦЁ!»

Маштабная акцыя ад МНС набірае абароты

На Міншчыне супрацоўнікі МНС праводзяць акцыю «Не прапальвай сваё жыццё!». У яе рамках ратавальнікі арганізоўваюць маршруты па домаўладаннях. Галоўная задача — прафілактыка, такія рэйды і мерапрыемствы накіраваны на мінімізацыю няшчасных выпадкаў. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся падрабязнасці. СТАР. 11

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД НЕ ПАВІНЕН ЦІСНУЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак, перш чым пачаць пасяджэнне, кіраўнік дзяржавы сказаў аб тым, што яго непакоіць у частцы дзейнасці УНС.

«Я вырашыў сёння правесці пасяджэнне Прэзідыума ў такім шырокім складзе, паколькі нам трэба вырашыць галоўнае пытанне. Можа, нават і не вырашыць, яно вырашана Канстытуцыяй. Мы ўсе павінны разумець, што Усебеларускі народны сход нікому не павінен перашкаджаць працаваць. УНС не павінен ціснуць на іншыя органы ўлады, бо мы створым самі сабе праблему», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што пакуль пасады Старшыні УНС і Прэзідэнта сканцэнтраваны ў адной асобе, такое не адбудзецца. Але потым гэта можа прывесці да сур'ёзных праблем.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што ўсе прапановы, якія на працягу паўгода ўносіліся на яго разгляд аб структуры Прэзідыума УНС, аб узаемадзеянні старшыні і Прэзідыума УНС з дэлегатамі, ён вырашыў разгледзець калегіяльна, з членамі Прэзідыума. «Але галоўнае, я сказаў, мы, я маю на ўвазе УНС і Прэзідыум, ні ў якім разе нікому не перашкаджаем з органаў улады і не ціснем на іх. Кожны займаецца сваёй справай. Гэта ўжо дзесяцігоддзямі ў нас «устаканілася», усе гэта разумеюць», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу на існуючае меркаванне аб тым, што вышэйшы прадстаўнічы орган УНС зверху і мае права рабіць усё ў краіне. Але, зрабіў акцэнт беларускі лідар, з такім падыходам жыць нельга — месца УНС вызначана Канстытуцыяй. «Але гэта агульнае палажэнне, агульныя патрабаванні, агульныя функцыянальныя абавязкі УНС. А вось у дэталях, у канкрэтыцы заўсёды бывае наадварот», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У прыклад ён прывёў падыходы да нацыянальнай бяспекі: «Калі вызначана, што УНС прымае рашэнні ў плане нацыянальнай бяспекі (вайна і мір і іншае), — гэта толькі паўнамоцтвы УНС. Прэзідэнт уносіць, калі, не дай бог, вайна або пагроза вайны, — збіраем УНС, уносім прапанову, разглядаем і пераводзім краіну на ваенныя рэйкі, калі раптам заўтра вайна (я бяру крайні прыклад)». Такі ж падыход, паводле яго слоў, датычыцца і кадравых рашэнняў, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі УНС.

УНС павінен займацца выключна сваімі пытаннямі

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што на ўзроўні Прэзідыума УНС павінны разглядацца выключна важныя пытанні. «УНС не можа драбніць. Гэта не значыць, што мы заўтра будзем збіраць, як пленумы ЦК, чатыры разы на год пасяджэнні і будзем там нейкія абмяркоўваць пытанні і рабіць выгляд, што мы моцна працуем і заклапочаны нейкім пытаннем. УНС павінен займацца выключна па Канстытуцыі сваімі пытаннямі. З гэтага павінна зыходзіць і структура, і ўзаемаадносіны Прэзідыума, Старшыні Прэзідыума з дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу», — растлумачыў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што паўнамоцтвы УНС паміж пасяджэннямі выконвае Прэзідыум. Па яго словах, дастаткова праводзіць па два-тры пасяджэнні Прэзідыума на год па назапашванні пытанняў. Прычына нязменная — не драбніць і не часціць.

Яшчэ адно абазначанае Старшынёй УНС пытанне — узаемадзеянне з дэлегатамі ў перыяд паміж пасяджэннямі Усебеларускага народнага сходу. «Яшчэ раз паўтараю: ніякага дубліравання, ніякага ціску. УНС павінен заняць сваё месца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама ў цэнтры ўвагі Прэзідыума УНС цяпер — Рэгламент Усебеларускага народнага сходу (сёння дзейнічае часовы рэгламент), распрацоўка якога вядзецца. Прэзідэнт паставіў задачу падрыхтаваць яго да пасяджэння Усебеларускага народнага сходу.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што 26 студзеня ў краіне пройдуць прэзідэнцкія выбары, і пракаментаваў падрыхтоўку праграмы, якую прадставяць да ўвагі грамадзян. «Паколькі ў нас адзінства пэўнае ёсць, праграма дзеючага Прэзідэнта, якая выпрацоўваецца сёння ўсімі намі, — гэта будзе арыенцір у студзені, снежні нават, для ўсяго беларускага народа. А вось дэталізаваць на аснове гэтай праграмы заданні на будучы год і, магчыма, погляд на пяцігодку мы зможам пасля прэзідэнцкіх выбараў», — сказаў ён.

У парадак дня пасяджэння Прэзідыума УНС таксама ўключана пытанне аб колькасці суддзяў Вярхоўнага Суда. Кіраўнік дзяржавы вынес на разгляд яшчэ адно пытанне — бяспека, асабліва ў электаральны перыяд і пасля выбараў. Але гэтая тэма разглядалася за зачыненымі дзвярыма. СМІ і грамадскасць па гэтым пытанні будуць праінфармаваны пазней.

Старшыні райвыканкамаў не нясуць той нагрузкі, якую павінны

Аляксандр Лукашэнка азначыў яшчэ адно пытанне, якое не ўваходзіць у непасрэдныя паўнамоцтвы Прэзідыума, — праект указа аб статусе старшынь райвыканкамаў, вынесены на разгляд кіраўніка дзяржавы. Па словах Прэзідэнта, перш чым падпісваць гэты дакумент, ён хацеў бы пачуць меркаванні ўсіх адказных. А паколькі пасяджэнне Прэзідыума УНС праходзіць у пашыраным складзе з удзелам губернатараў, вышэйшых службовых асоб, якія маюць адносіны да фарміравання ўзроўняў улады, мэтазгодна разгледзець яго калегіяльна на гэтым мерапрыемстве.

Прэзідэнт нагадаў, што ён часта ўзнімаў пытанне аб тым, што старшыня райвыканкама задзейнічаны не так, як належыць. «Яны не нясуць той нагрузкі, якую павінны несці старшыні райвыканкамаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, крытэрыем іх работы з'яўляецца рэалізацыя даручэння «Адзін раён — адзін праект». Аднак, як заўважыў Прэзідэнт, не ўсе кіраўнікі раёнаў займаюцца гэтым даручэннем. «Гэта эфектыўнасць нашай улады, пачынаючы ад Прэзідэнта і заканчваючы губернатарамі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але, з іншага боку, нашы юрысты канстатавалі факт, што няма нарматыўна-прававога акта, які б дакладна распісаў, чым павінен займацца старшыня райвыканкама. А калі ёсць, дык гэтага недастаткова. Дык давайце прымем гэтае рашэнне. Бо калі губернатары і старшыні гар- і райвыканкамаў працуюць нармальна, то краіна будзе ў парадку».

Фота БелТА.

Фінансы, будаўніцтва, кадры

Падрабязна аб праекце ўказа далажыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. Ён падкрэсліў, што моцныя рэгіёны вызначаны прыярытэтам будучай пяцігодкі. Паводле вынікаў рэгіянальных паездак кіраўнік дзяржавы паставіў шэраг актуальных на сучасным этапе задач перад старшынямі райвыканкамаў. Асноўная мэта — спыніць адток эканамічна актыўнага насельніцтва. З сярэдняга раёна на 8-10 тысяч занятых у эканоміцы, паводле інфармацыі Белстата, з'язджае 300—400 чалавек штогод. Гэта шмат. Дзмітрый Крутой нагадаў, што ў якасці мер для вырашэння падобных праблем Прэзідэнт звяртаў увагу раённых кіраўнікоў на шэраг пытанняў. Сярод іх — тэрміновае аднаўленне райаграсэрвісаў, будаўнічых перасоўных механізаваных калон, ДРБУ, сельгасхімій, арганізацый, якія адказваюць за абслугоўванне даільных установак, бурэнне свідравін, забеспячэнне палівам. Ад кіраўніцтваў раёнаў чакаюць пераўтварэнняў у АПК. «Пунктавае, эканамічна абгрунтаванае і фінансава выверанае аб'яднанне гаспадарак у прывязцы да лідараў, маякоў раёна. Аднаўленне або пашырэнне практыкі выкарыстання мехатрада для ўнясення ўгнаенняў, узворвання глебы, уборкі ўраджаю ва ўстаноўленыя тэрміны. Перамяшчэнне жывёлы на новыя малочнатаварныя комплексы, паскораная меліярацыя, работа са старымі дамамі, добраўпарадкаванне зямель і ўключэнне іх у сельскагаспадарчы абарот», — пералічыў асноўныя з гэтых пераўтварэнняў Дзмітрый Крутой. Яшчэ адзін кірунак — актыўнае ўцягванне ў працу эканамічна незанятых грамадзян у раёнах. «Акрамя АПК як асновы эканомікі ў многіх нашых раёнах неабходна шукаць новыя пункты росту ў тым ліку праз працяг напрацаваных краінавых праграм: «Адзін раён — адзін праект», па развіцці паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны, па адраджэнні Палесся, па фарміраванні інтэграцыйных аграструктур Віцебшчыны і шэрагу іншых», — дадаў Дзмітрый Крутой.

Сёння паўнамоцтвы і правы старшынь райвыканкамаў у асноўным распісаны ў базавым Законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» ад 2010 года. Па словах Дзмітрыя Крутога, распрацоўшчыкі праекта ўказа аб узмацненні ролі старшынь раёнаў засяродзілі ўвагу на вырашэнні актуальных вышэйпералічаных пытанняў. Для распрацоўкі дакумента пры Адміністрацыі Прэзідэнта была створана працоўная група з 18 чалавек. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы дзевяць з іх — дзеючыя або былыя старшыні райвыканкамаў, цяпер яны з'яўляюцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў або членамі Савета Рэспублікі. «Акрамя таго, мы запыталі меркаванне ўсіх старшынь райвыканкамаў. Са 118 свае прапановы прадставілі 75. Сорак тры кіраўнікі прапановы не прадставілі і сказалі, што ім дастаткова той нарматыўнай базы, якая існуе. Увесь гэты масіў інфармацыі будзе апрацаваны і абмеркаваны з усімі зацікаўленымі», — распавёў Дзмітрый Крутой. Прапановы, якія паступалі, ён разбіў на некалькі блокаў.

Першы — бюджэт і фінансы. У адпаведнасці з праектам указа старшыні райвыканкамаў надзяляюцца правам распараджацца часткай раённага бюджэту, якая засталася на пачатак бягучага фінансавага года. Але тут ёсць умовы: у бюджэту не павінна быць даўгоў перад вышэйстаячым бюджэтам, а таксама пратэрмінаванай крэдыторскай запазычанасці. Старшыня таксама атрымлівае права распараджацца сродкамі рэзервовага фонду райвыканкама. Раённы кіраўнік таксама надзяляецца правам ажыццяўляць дзяржаўныя закупкі тавараў і паслуг з адной крыніцы — у арганізацыях, больш за 25 працэнтаў маёмасці або акцый якіх знаходзіцца ў дзяржуласнасці. «У праекце ўказа таксама закладзена норма, што пры фарміраванні бюджэту на 2025—2026 гады мы захоўваем аб'ём датацый па ўсіх узроўнях раённых бюджэтаў не ніжэй за ўзровень 2024 года. Ніжнюю планку захоўваем на ўзроўні 2024 года. Усім, што зарабілі, і ў плане рэзервовага фонду старшыні атрымаюць права распараджацца самастойна», — дадаў Дзмітрый Крутой.

Другі блок — будаўніцтва і добраўпарадкаванне. «Першая тэма — прыцягненне арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў і нашых грамадзян з іх згоды да добраўпарадкавання і ўтрымання тэрыторый за свой кошт або на ўмовах раўнадолевага ўдзелу. Пакуль у нас у заканадаўстве норма «падтрыманне належнага санітарнага стану». Тэрмін «добраўпарадкаванне» шырэйшы, чым проста санітарны стан. На прыкладзе грамадзян гэта пакос травы ці проста роўныя платы, да прыкладу, адсутнасць смецця. Добраўпарадкаванне — гэта ўжо дадатковыя некаторыя элементы, якія патрабуюць і фінансавага забеспячэння. Гэта значыць, пашыраем тэму», — растлумачыў Дзмітрый Крутой.

На другую тэму кіраўнік дзяржавы звяртаў увагу падчас сваёй паездкі ў Клімавічы — гэта знос аварыйных будынкаў. Праект указа дае старшыням райвыканкамаў паўнамоцтвы самастойна вырашаць гэтыя набалелыя праблемы. За зіму па кожным раёне будзе вызначаны пералік такіх аб'ектаў і аб'ём фінансавых рэсурсаў на рэспубліканскім і абласным узроўнях. Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што непасрэдна на месцах гэтыя пытанні — зона адказнасці раённых кіраўнікоў. Трэцяе пытанне, паводле слоў Дзмітрыя Крутога, часта ўзнімаецца на асабістых прыёмах грамадзян — гэта магчымасць рэалізацыі карысных выкапняў з так званых унутрыгаспадарчых кар'ераў. У асноўным гэта пясок, які ідзе на мясцовыя патрэбы. Па праекце ўказа, гэта становіцца зонай адказнасці старшыні райвыканкама, але з некаторымі абмежаваннямі, устаноўленымі ўрадам.

Трэці блок — кадры. У законе аб мясцовым самакіраванні ўжо ёсць цэлы блок кадравых паўнамоцтваў на ўзроўні кіраўнікоў раёнаў. Праектам указа вызначаецца пералік службовых асоб, якія будуць узгадняцца старшынёй райвыканкама. У прыватнасці, гэта кіраўнікі арганізацый, якія маюць важнае значэнне для раёна: іх прапанавана зацвярджаць спісам на ўзроўні аблвыканкама (па кожным раёне). Урад прапануе

НІКОМУ НЕ ПАВІНЕН ПЕРАШКАДЖАЦЬ ПРАЦАВАЦЬ, НА ІНШЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ»

выключыць са спіса пасады кіраўнікоў арганізацый прыватнай формы ўласнасці, а таксама кіраўнікоў з кадравага рэестра Прэзідэнта або Савета Міністраў. Старшыні райвыканкамаў, у сваю чаргу, прапаноўваюць даць ім паўнамоцтвы ўзгадняць намеснікаў кіраўнікоў арганізацый камунальнай формы ўласнасці. У спіс таксама прапануюць уключыць спецыялістаў у сферы АПК.

Нам патрэбны вычарпальны дакумент

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на паўнамоцтвах кіраўнікоў райвыканкамаў у кадравых пытаннях. «Нам патрэбны вычарпальны дакумент. У старшыні райвыканкама ён павінен як настольная кніжка ляжаць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Старшыня ёсць старшыня. Ён павінен займацца ўсім. Нічога страшнага, калі ён у нейкім сэнсе будзе прызначаць, зацвярджаць, узгадняць кіраўнікоў прыватных структур. Тады і ўплыў будзе ў іх на гэта». Прэзідэнт падкрэсліў, што ўсе прадпрыемствы ў раёне найважнейшыя. Таму, паводле яго слоў, райвыканкам павінен бачыць і ведаць усіх іх кіраўнікоў, у тым ліку і прыватных, якіх у кожным раёне не так шмат.

Аляксандр Лукашэнка раіць больш паўнамоцтваў аддаваць не старшыні, а выканкаму. «Ён носіць, прапануе, а выканкам зацвярджае. Ну, сёе-тое вырашае старшыня выканкама. Яны старшыні выканкамаў. Яны, вобразна кажучы, прэзідэнты на гэтай тэрыторыі, як я гавару. Але яны не прэзідэнты. Гэтак жа, як і прэм'ер-міністр. Ён — старшыня ўрада, у яго ёсць пэўныя асабістыя паўнамоцтвы, але ён асабіста не можа прыняць ні адзін нарматыўны прававы акт. Мы тут блытаць не павінны. І не ствараць вертыкаль дыктатуры ад Прэзідэнта да старшыні сельскага Савета. Гэта чырвоная нітка. Мы тут ні ў якім разе не павінны пераступіць», — выказаў свае заўвагі Аляксандр Лукашэнка.

Галоўным кіраўнік дзяржавы назваў работу з кадрамі. «Партыі няма, райкама і абкама партыі няма... Гэта ўсё вырашаецца тут. І не трэба гэта замыкаць на аднаго чалавека, нават калі гэта старшыня. Так, ён уносіць любое пытанне... Абмяркоўваюць, ён змагаецца, змагаецца, але выканкам прымае рашэнне па ўсіх кадрах, якія там ёсць. Што дрэннага, калі ён узгодніць кандыдатуры начальніка РАУС, начальніка МНС і іншых, — адзначыў Прэзідэнт. — Можа, не ўзгадніць, але старшыня аблвыканкама можа прызначыць, і ён нясе адказнасць за гэта. Вы можаце не ўзгадніць любую кандыдатуру, гэта ваша права. Я магу гэта ўлічыць, магу не ўлічыць. Гэтую логіку трэба захаваць. Гэта ад жыцця ўжо».

«Але калі мы хочам, каб раён кіраваўся, мы не павінны трыма пальцамі нешта адарваць і даць старшыні райвыканкама. А гэта — не, гэта не тваё. Ну, дык ён і працаваць так будзе», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што канчатковае рашэнне па статусе старшынь райвыканкамаў павінна мець выгляд нарматыўнага прававога акта, а не пратакола даручэнняў, каб кіраўнікі на месцах неслі поўную адказнасць.

Фота БелТА.

Калі будзе гатова «настольная кніга» для старшынь райвыканкамаў

Падрабязнасцямі праекта ўказа ў Дзмітрыя Крутога актыўна цікавіліся і журналісты. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта расказаў, што па выніках абмеркавання гэтага дакумента на пасяджэнні Прэзідыума УНС было прынята рашэнне не выдаваць новы ўказ, а падрыхтаваць новую рэдакцыю закона, каб засяродзіць у адным дакуменце ўсё, што датычыцца работы старшынь райвыканкамаў, іх паўнамоцтваў, правоў і абавязкаў. Логіка наступная: у краіне дзейнічае закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні. У ім цэлыя раздзелы прысвечаны паўнамоцтвам, правам, кампетэнцыям і адказнасці мясцовых органаў улады. Усе дадатковыя паўнамоцтвы раённых кіраўнікоў, якія неабходна ім надаць, будуць прапісаны ў гэтым дакуменце. Такім чынам, закон у далейшым стане своеасаблівай канстытуцыяй для кіраўнікоў на месцах ці настольнай кнігай, як адзначаў Прэзідэнт. Ён паставіў задачу дапрацаваць закон ужо ў першым квартале 2025 года.

Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што для старшынь райвыканкамаў ключавым з'яўляецца блок, звязаны з фінансамі. Па яго словах, раённыя кіраўнікі чакаюць больш сур'ёзнай фінансавай падтрымкі. На пасяджэнні Прэзідыума УНС абмяркоўвалася пытанне магчымага падатковага перараз мяркавання ў маштабах усёй краіны, расказаў Дзмітрый Крутой. Ён звярнуў увагу на тое, што за апошнія 20 гадоў у Беларусі адбылася сур'ёзная цэнтралізацыя ключавых падаткаў, што ўплывае на сістэму датацый і сістэму субвенцый бюджэтаў як абласнога, так і раённага ўзроўняў. І сёння старшыні райвыканкамаў хацелі б пакідаць больш падаткаў ад тых прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёнаў. «Улічваючы, што асноўныя падаткаплацельшчыкі ў сярэдніх раёнах — гэта сельскагаспадарчыя арганізацыі або арганізацыі лясной гаспадаркі, то ўвесь спектр падаткаў яны хацелі б захаваць у сябе», — растлумачыў Дзмітрый Крутой. У выніку дыскусіі наконт гэтага пытання Прэзідэнт прыняў «саламонава рашэнне» — пакідаць у раёне ўсе падаткі, але толькі ад тых прадпрыемстваў, якія будуць створаны з 2025 года. І распаўсюдзіць дзеянне гэтай нормы, напрыклад, да 2030 года, гэта значыць, на перыяд дзеяння наступнай праграмы пяцігодкі. Мяркуецца, што гэта будзе стымуляваць мясцовыя ўлады да адкрыцця такіх прадпрыемстваў, ажывіць ініцыятыву «Адзін раён — адзін праект», будзе стымулам для стварэння больш прыдатных умоў для інвестараў. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу, што гэтая ідэя пакуль унесена як прапанова, якую яшчэ трэба будзе дакладна абмеркаваць на розных узроўнях, каб ні ў якім разе не парушыць створаную сістэму бюджэтна-падатковай палітыкі. Акрамя таго, спачатку такія падыходы будуць праверaны на пілотных раёнах, падобных па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця, колькасці насельніцтва, колькасці бюджэтных і камерцыйных арганізацый і іншых крытэрыях. Цяпер, па словах Дзмітрыя Крутога, старшыні райвыканкамаў скардзяцца на залішне забюракратызаваную працэдуру афармлення работ па зносе старых, закінутых будынкаў, якія не эксплуатуюцца. У новым законапраекце прапануецца надзяліць кіраўнікоў раёнаў паўнамоцтвамі самастойна вырашаць пытанні па такіх аб'ектах. «Прэзідэнт даручыў у тэрміновым парадку перадаць гэта ўсё на раённы ўзровень і максімальна хутка ўсё гэта спрасціць», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Што датычыцца работы старшынь райвыканкамаў з кадрамі, то, па словах Дзмітрыя Крутога, канцэптуальна агучаныя падыходы падтрыманы. «Прэзідэнт лічыць, што для ўмацавання паўнамоцтваў старшынь райвыканкамаў яны павінны ўдзельнічаць ва ўзгадненні фактычна ўсёй улады не толькі той, якая датычыцца дзяржаўных органаў на тэрыторыі раёна, але і кіраўніцтва і дзяржаўных, і камерцыйных арганізацый. Гэта прынцыповае пытанне дадзенага дакумента, і яно канцэптуальна падтрымана», — расказаў ён.

Дзмітрый Крутой звярнуў увагу, што раней існаваў пэўны прабел у частцы таго, на падставе якіх нарматыўных дакументаў старшыні райвыканкамаў змогуць рэалізоўваць свае паўнамоцтвы і даводзіць пэўныя рашэнні да выканаўцаў. Агульная норма аб тым, што прымаецца распараджэнне райвыканкама без якой-небудзь сур'ёзнай адказнасці з боку выканаўцы і наяўнасць толькі дысцыплінарных мер спагнання не дазваляюць у поўнай меры рэалізоўваць рэгіянальную палітыку. Асаблі ва ў адносінах захавання тэхналагічных рэгламентаў. «На пасяджэнні Прэзідыума УНС было вырашана, што адной з формаў стануць пісьмовыя прадпісанні старшыні райвыканкама. У нас ёсць Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, таму ў выпадку невыканання гэтых пісьмовых прадпісанняў будзе ўведзена фінансавая адказнасць да 40 базавых велічынь — спецыялісты будуць несці ўжо матэрыяльную адказнасць. Гэта таксама павысіць статус і ўзровень дакументаў, якія будуць даводзіцца старшынямі раёнаў», — растлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ У тэму

Наступнае пасяджэнне УНС пройдзе пасля прэзідэнцкіх выбараў

У размове з журналістамі ўдзельнікі пасяджэння Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу падвялі некаторыя яго вынікі. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой расказаў, што па тэме ўзаемадзеяння дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу з органамі ўлады Прэзідэнтам быў выказаны шэраг заўваг. Ён звярнуў увагу, што роля Прэзідыума ў бягучых рэаліях і ў іерархіі нашай улады — гэта рыхтаваць самыя канцэптуальныя пытанні, звязаныя з развіццём нашай краіны ў эканамічнай, ваенна-палітычнай, інфармацыйнай сферах для разгляду ўжо непасрэдна на УНС. Пра тое, што Усебеларускі народны сход не павінен драбніць, казаў і Прэзідэнт падчас пасяджэння.

Па словах Дзмітрыя Крутога ў найбліжэйшы час упор будзе зроблены на падрыхтоўку праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на наступныя пяць гадоў: «Контуры гэтай праграмы будуць абазначаны ў перадвыбарнай праграме нашага Прэзідэнта і далей будуць развівацца праз Пасланне кіраўніка дзяржавы, якое ён агучвае на УНС. Таму Прэзідэнт папрасіў не драбніць, не блытаць людзей, не часціць з правядзеннем пасяджэння Прэзідыума, не заблытваць органы ўлады ў плане дубліравання або падмены нейкіх пытанняў, а выбудаваць дакладную і зразумелую сістэму, калі дэлегаты з вялікай масы пытанняў, якія паступаюць ад грамадзян, будуць выбіраць найважнейшыя, прынцыповыя і канцэптуальныя, разглядаць іх на рэгіянальным узроўні, потым уносіць праз Сакратарыят на пасяджэнне Прэзідыума і затым, калі будзе адабрэнне і ўзгадненне, — на УНС».

Журналісты пацікавіліся, калі запланавана правядзенне наступнага пасяджэння Усебеларускага народнага сходу. Дзмітрый Крутой адзначыў, што падчас перадвыбарнай кампаніі няма сэнсу паглыбляцца ў на гэтыя пытанні. Цяпер кіраўнік дзяржавы працуе над перадвыбарнай праграмай з асноўнымі пасыламі. Затым Прэзідэнт пачне падрыхтоўку да Паслання, а напярэдадні пасяджэння УНС яшчэ раз будзе сабрана пасяджэнне Прэзідыума, каб звярыць пазіцыі і канчаткова ўзгадніць тыя пытанні, якія будуць выносіцца на пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу.

Прэзідыум УНС скараціў колькасць суддзяў Вярхоўнага Суда

Старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін Сукала расказаў, з чым звязаны разгляд колькасці суддзяў Вярхоўнага Суда на пасяджэнні Прэзідыума УНС. Ён нагадаў, што ў сакавіку гэтага года парламент прыняў такі важны акт, як Кодэкс грамадзянскай вытворчасці, які ўніфікуе судовыя працэдуры як у эканамічным правасуддзі, так і ў грамадзянскім. Для таго, каб рэалізаваць гэты кодэкс, неабходны некаторыя змены ў судовым ладзе краіны — неабходна стварэнне новага Апеляцыйнага эканамічнага суда, каб зрабіць яго судом другой інстанцыі. І Вярхоўнаму Суду было даручана на працягу шасці месяцаў унесці Прэзідэнту прапановы аб стварэнні такога суда. «Сутнасць заключаецца ў тым, што гэты новы суд неабходна стварыць за кошт уласных сродкаў судовай сістэмы, гэта значыць, шляхам перамяшчэння ўнутры судовай сістэмы штатнай колькасці суддзяў. Для таго, каб ён запрацаваў, неабходна 27 суддзяў: 22 суддзі мы можам выключыць з дзейных эканамічных абласных судоў у сувязі са скарачэннямі кампетэнцый. І на пяць суддзяў неабходна зменшыць склад Вярхоўнага Суда, гэта значыць, перадаць іх у новы суд. І калі па 22 суддзях можа вырашыць кіраўнік дзяржавы сваім указам, то змены колькасці Вярхоўнага Суда цяпер уваходзяць толькі ў кампетэнцыі Прэзідыума УНС», — растлумачыў Валянцін Сукала. Прэзідыум на сённяшнім пасяджэнні гэтае рашэнне адобрыў. Валянцін Сукала ўдакладніў, што сёння штатная колькасць Вярхоўнага Суда складае 76 суддзяў, а пасля цяперашняга рашэння Прэзідыума УНС будзе 71.

Супрацоўніцтва

ЗА БУДУЧЫНЮ — РАЗАМ!

У БДУ пачаўся Тыдзень студэнцкай моладзі Беларусі і Расіі

Форум, прымеркаваны да 25-годдзя падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, аб'яднаў больш за 100 беларускіх і расійскіх студэнтаў. Тон урачыстасці, прысвечанай адкрыццю Тыдня, задаў рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ. Ён адзначыў, што форум — гэта не чарговая дамова з добрымі партнёрамі. Гэта маладзёжнае свята, мерапрыемства аб сэнсах і каштоўнасцях кожнага студэнта ўсіх нашых ВНУ ў сучасным свеце. І галоўнае, па яго словах, каб студэнты вучыліся задаваць пытанні: а хто я ёсць, а як мае каштоўнасці суадносяцца з каштоўнасцямі, задачамі, палітыкай дзяржавы, у якой я жыву.

ЧАС ВЫБРАЎ ВАС

— Маладосць — узрост смелых. Гэта дзіўны час, калі аптымізм, захопленасць, стваральная энергія з'яўляюцца лакаматывам для генерацыі інавацыйных ідэй на карысць Саюзнай дзяржавы, — сказала **намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Кацярына ПЯТРУЦКАЯ.** — Моладзь — самая актыўная частка грамадства са сваім светапоглядам, цікавымі ідэямі, імкненнем зрабіць свет лепшым. Сёння мы шукаем новыя падыходы да рэалізацыі маладзёжнай палітыкі нашых краін. Я ўпэўнена, што цяперашняе мерапрыемства прадставіць для гэтага шырокія магчымасці, і ў нас адбудзецца пасапраўднаму зацікаўлены і карысны абмен думкамі, які дапаможа абмеркаваць усе пытанні і стане стартавай пляцоўкай для будучых сумесных праектаў, дасць старт новым ініцыятывам, упіша сваю яркую старонку у маладзёжную палітыку і летапіс Саюзнай дзяржавы.

Рэктар Уладзімірскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Г. і Н. Г. Сталетавых Анзор САРАЛІДЗЕ зазначыў, што фармат вялікага форуму студэнцкай моладзі дазваляе больш глыбока пазнаць адзін аднаго. Ён звярнуў увагу на тое, што Беларусь і Расія працуюць сумесна ў розных праектах, у тым ліку і навукова-адукацыйных, а стасункі паміж нашай моладдзю дарагога каштуюць. Маладыя людзі шырока кантактуюць у сацыяльных сетках, але асабістых зносін, як правіла, не хапае. Немалаважна і тое, што ў форуме ўдзельнічаюць не толькі студэнты, а і настаўнікі, педагогі, сябры ўніверсітэтаў.

— Для нас гэта вельмі важна, таму што, прасоўваючы адзін аднаго, мы становімся мацней у гэтым свеце, — падкрэсліў рэктар расійскага ўніверсітэта. — Саюзная дзяржава вельмі актыўна працуе ва ўсіх фарматах. Маладзёжны праект дазволіць нам яшчэ больш развіць нашы асабістыя, сяброўскія і ўсебаковыя адносіны ў рамках адукацыйных, навуковых і грамадскіх праектаў.

Намеснік старшыні праўлення грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру», першая жанчына-касманаўт Беларусі Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ, — часты і жаданы госць у студэнцкім, ды і ў цэлым у маладзёжным асяроддзі краіны. Яна ацаніла мерапрыемства як вельмі важнае для развіцця адносін паміж Беларуссю і Расіяй, бо нішто так не спрыяе прагрэсу, як жывыя зносіны моладзі дзвюх краін.

— Мяне вельмі радуе сучасная моладзь. Гэта наша будучыня, ад яе залежыць тое, якім будзе заўтра, — сказала касманаўт. — Я рада, што ў нас ёсць такія грандыёзныя пляцоўкі, як сённяшняе мерапрыемства, вельмі важнае для ўсіх нас. Бо нават наш праект — палёт першага беларускага касманаўта — адбыўся менавіта ў рамках Саюзнай дзяржавы. Гэта доказ нашага сяброўства, сілы і моцы, гэта азначае тое, што разам мы можам усё, нават скарыць космас, — сказала касманаўт.

Аб стварэнні належных умоў, якія дазволяць любому маладому чалавеку рэалізаваць сябе, распавёў Андрэй Кароль.

— Мы добра разумеем, што моладзь заўсёды ўспрымальная да новых ініцыятыў, — звярнуўся ён да прысутных. — Па вялікім рахунку тыя глабальныя тэктанічныя зрухі, разбурэнне старога светапарадку, заснаванага на маналогу дамінавання аднаго полюса, спараджаюць вельмі глыбокія расколіны, спараджаюць лакуны. Гэтыя лакуны павінны быць запоўненыя. Гэта не гаспадарчыя дагаворы, калі мы сёння ўкладваем рубель, а праз год атрымліваем дзесяць рублёў. Адукацыя — гэта доўгайграючы працэс, асабліва ў выхаванні. Мы разумеем, што тая хвіліна ўвагі, якую мы сёння аддаём студэнту, вернецца праз тры, пяць, дзесяць гадоў, калі выпускнікі стануць кіраўнікамі і ад іх рашэнняў будзе залежаць надта шмат у жыцці саюзных краін. Я вельмі разлічваю, што наша моладзь, а прымае ў мерапрыемстве ўдзел больш як сто студэнтаў з 15 расійскіх і беларускіх універсітэтаў, па-новаму паглядзіць на штодзённасць.

МІСІЯ БДУ — «БЫЦЬ ЗАЎСЁДЫ ПЕРШЫМ!»

Асноўнае мерапрыемства Тыдня студэнцкай моладзі Беларусі і Расіі — пленарнае пасяджэнне — пачалося з экскурсу ў гісторыю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і агляду яго сучаснасці.

— Сёння БДУ — гэта флагман вышэйшай адукацыі краіны, яе навуковы і культурны цэнтр. За сваю больш чым стагадовую гісторыю ўніверсітэт стаў заснавальнікам 12 сучасных ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў, Нацыянальнай бібліятэкі. За гэтыя гады колькасць навучэнцаў БДУ павялічылася ў 17 разоў, выкладчыкаў — у 36.

Звярнуў увагу рэктар на прызначэнне ўніверсітэта, якое заключаецца ў дапамозе студэнтам у раскрыцці ўнутранага патэнцыялу. Місія БДУ дае наказ — «Быць заўсёды першым!» Для гэтага вядучая беларуская ВНУ актыўна развівае інфраструктуру, навуковае ўзаемадзеянне і абменваецца вопытам з найлепшымі ўніверсітэтамі свету. У якасці прыкладу Андрэй Кароль прывёў партнёрскія адносіны з МДУ імя М. В. Ламаносава. Дарэчы, адукацыйныя і навуковыя сувязі паміж універсітэтамі налічваюць больш чым 100 гадоў. Кульмінацыйным этапам іх паглыблення стала міжуніверсітэцкае свята «Дні дружбы БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава», якое было заснавана ў 2018 годзе.

Падчас прамовы Андрэй Кароль звярнуўся да тэмы галоўных сэнсаў універсітэцкай адукацыі нашага часу. Ён расказаў аб неабходнасці развіцця крэатыўнага мыслення ў студэнтаў. Рэктар нагадаў, што ў БДУ рэалізуецца сістэма эўрыстычнага навучання на аснове дыялогу. Яна накіравана на актыўную дзейнасць, уцягванне студэнта, яго адкрыццё праз распрацоўку свайго адукацыйнага прадукту. Важным аспектам сучаснай адукацыі ён таксама назваў аб'яднанне навучання і выхавання, а яшчэ міждысцыплінарны падыход, які рэалізуецца пры адкрыцці новых спецыяльнасцяў, планаванні тэм для курсавых, дыпломных, магістарскіх работ, навукова-інавацыйных праектаў.

НА ДЗЕЛАВОЙ ПЛАТФОРМЕ

У першы ж дзень работы Тыдня студэнцкай моладзі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт падпісаў пяць пагадненняў аб супрацоўніцтве ў галіне маладзёжнай палітыкі з шэрагам расійскіх ВНУ. Былі завераны дакументы паміж БДУ і Уладзімірскім дзяржаўным універсітэтам імя А. Г. і М. Г. Сталетавых, Валгаградскім дзяржаўным універсітэтам, Наўгародскім дзяржаўным універсітэтам імя Яраслава Мудрага, Пскоўскім дзяржаўным універсітэтам і Разанскім дзяржаўным універсітэтам імя С. А. Ясеніна.

— Гэтыя пагадненні дадуць больш прававых падстаў для моладзі размаўляць адзін з адным на самых розных узроўнях, — канстатаваў рэктар БДУ.

Пакет дакументаў таксама абазначыў прыярытэтныя кірункі супрацоўніцтва бакоў: грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, фарміраванне здаровага ладу жыцця, падтрымка дзейнасці маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, арганізацыя занятасці і вольнага часу студэнтаў, развіццё міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва.

У РЭЖЫМЕ «НОН-СТОП»

Маладзёжны тыдзень, як і належыць падобнаму форуму, насычаны самымі разнастайнымі падзеямі. Кожны дзень — канкрэтная тэматыка. Першы дзень, напрыклад, прайшоў пад знакам гістарычнай памяці і праўды. А ключавой падзеяй стала дыялогавая пляцоўка па праблематыцы Вялікай Айчыннай вайны і вынікаў расследавання генацыду беларускага народа. Студэнты даведаліся пра сучасныя тэндэнцыі распаўсюджвання постпраўды, стварэнне фэйкавых навін ва ўмовах развіцця штучнага інтэлекту.

Закране моладзь і пытанні сямейных каштоўнасцяў. Аб гэтым з дапамогай медыяцыі раскажа дырэктар Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ Аксана Здрок. Духоўна-маральныя каштоўнасці Саюзнай дзяржавы абмяркуюць 21 лістапада. Тэма заключнага дня — «Патрыятычныя каштоўнасці Саюзнай дзяржавы».

Акрамя гэтых ключавых мерапрыемстваў, будуць праходзіць асветніцкія акцыі і практычныя даследаванні, эксперыменты, выставы і інтэрактыўныя пляцоўкі, якія прадстаўляюць дзейнасць факультэтаў і інстытутаў БДУ. Для ўдзельнікаў форуму падрыхтаваны відовішчныя хімічныя доследы, майстар-клас па кітайскай каліграфіі, прадстаўлены аэракасмічныя тэхналогіі БДУ і яшчэ шмат чаго цікавага. Усё, што дапаможа ім даведацца (і ацаніць) фундаментальнасць і разнастайнасць адукацыйнага, навуковага, студэнцкага жыцця Белдзяржуніверсітэта.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота дадзена БДУ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт Бразіліі заявіў аб правале глабалізацыі на аснове неаліберальных каштоўнасцяў

Узровень экстрэмізму і гвалту ў свеце працягвае расці. Пра гэта заявіў прэзідэнт Бразіліі Луіс Інасіу Лула да Сілва на саміце Групы дваццаці (G20) у Рыа-дэ-Жанейра, паведаміла ТАСС. «Неаліберальная глабалізацыя пацярпела крах. Ва ўмовах усё большай нестабільнасці міжнародная супольнасць, здаецца, змірылася з бязмэтным плаваннем у спрэчках наконт таго, хто мацнейшы», — адзначыў ён. Лула да Сілва заклікаў да больш хуткай рэформы ААН і Савета Бяспекі. «У гэтым годзе рэформа глабальнага кіравання ўпершыню ўвайшла ў парадак дня G20. Бяздзейнасць Савета Бяспекі сама па сабе з'яўляецца пагрозай міжнароднаму міру і стабільнасці», — лічыць бразільскі лідар.

Хваля звальненняў захліснула польскі аўтапрам

Польская аўтамабільная прамысловасць знаходзіцца ў крызісе: прадпрыемствы закрываюцца, а работнікаў звальняюць. Аб гэтым паведаміла выданне Rzeczpospolita. Паводле даных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення Польшчы, са снежня мінулага года да верасня 2024-га колькасць занятых у аўтамабілебудаванні работнікаў скарацілася з 204 тысяч да 197 тысяч. «І гэта прэлюдыя да больш маштабных скарачэнняў, асабліва сярод вытворцаў дэталяў і камплектуючых. Правіла тут простае: менш вырабленых аўтамабіляў азначае меншы попыт на дэталі», — адзначыў старшыня польскай Асацыяцыі дыстрыб'ютараў і вытворцаў запчастак Томаш Бенбен. У прыватнасці, сёлета ў першым квартале былі закрыты фабрыкі аўтобусаў Volvo ў Вроцлаве і Scania ў Слупску. У канцы верасня закрылася фабрыка SFC Solutions у горадзе Пётркув-Трыбунальскі. У лістападзе спыніла дзейнасць фабрыка рухавікоў FCA Powertian у горадзе Бельска-Бяла.

Сталіцу Індыі накрыў анамальны смог

Забруджванне паветра ў Нью-Дэлі дасягнула надзвычайнага ўзроўню. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі». Адзначаецца, што якасць паветра на поўначы Індыі рэзка пагоршылася літаральна за апошні тыдзень. Зарэгістраваны ўзровень забруджвальных рэчываў PM2,5 — небяспечных канцэрагенных мікрачасцінак, якія трапляюць у крывацёк праз лёгкія, — больш чым у 50 разоў вышэй таго, што рэкамендуецца Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя як дзённы максімум. Бальніцы індыйскай сталіцы паведамляюць аб рэзкім росце колькасці пацыентаў, якія «паступаюць з праблемамі дыхання і страўнікава-кішачнага тракту, выкліканых забруджваннем». З-за смогу ў Індыі парушаны авіязносіны. Улады Нью-Дэлі закрываюць школы, у горадзе забаронены будаўнічыя работы.

ЗАМАЦАВАЦЦА НА ЗЯМЛІ

КАДРЫ ДЛЯ МАШТАБНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

— Уладзімір Аляксеевіч, колькі маладых спецыялістаў штогод размяркоўваецца ў сельскагаспадарчыя арганізацыі краіны? Колькі іх было сёлета?

— Найперш адзначу, што працэсы мадэрнізацыі, укаранення прынцыпова новых тэхналагічных спосабаў вытворчасці, якія адбываюцца сёння ў АПК, патрабуюць кадраў, здольных рэалізаваць маштабныя пераўтварэнні. І сістэма іх падрыхтоўкі цалкам адпавядае тым патрабаванням. Спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй рыхтуюць 4 аграрныя ВНУ, з сярэдняй спецыяльнай — 37 каледжаў, кадры рабочых прафесій рыхтуюць 64 прафесійна-тэхнічныя каледжы.

Штогод у сельскагаспадарчыя арганізацыі накіроўваецца каля 6 тысяч спецыялістаў. Сёлета сельскагаспадарчыя арганізацыі прынялі каля 1,4 тысячы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і 4,2 тысячы спецыялістаў, рабочых з сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

— Ці супадае гэтая колькасць з колькасцю заявак на дыпламаваных спецыялістаў?

— Што датычыцца заявак сельскагаспадарчых арганізацый і колькасці выпускнікоў, якія атрымалі адукацыю на бюджэтнай аснове і падлягаюць размеркаванню, то па шэрагу вострадэфіцытных спецыяльнасцяў — «Ветэрынарная медыцына», «Аграномія», «Заатэхнія» — яны ў поўным аб'ёме не задавальняюцца.

Аднак у тых сельгасарганізацыях, дзе правільна плануюць працэс аграпрамысловай вытворчасці, выбудоўваюць прадуманую кадравую палітыку і клапоцяцца аб забяспечанасці кадрамі на перспектыву, абавязкова праводзіцца прафарыентацыйная работа па адборы выпускнікоў школ для іх навучання на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, даюцца магчымасці для навучання ў завочнай форме і павышэння кваліфікацыі работнікаў прадпрыемстваў. Пры такім падыходзе кадравыя пытанні паспяхова вырашаюцца.

— У свой час востра стаяла пытанне з недахопам заатэхнікаў і ветэрынараў. Як сёння ідуць справы?

— Ні для кога не сакрэт, што апошнім часам у моладзі аграрныя прафесіі менш папулярныя, чым, напрыклад, спецыяльнасці ў сферы IT. Разумеючы важнасць падрыхтоўкі кадраў для вёскі, на дзяржаўным узроўні пастаянна прымаюцца меры, накіраваныя на павышэнне прэстыжу сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў, і такіх прэферэнцый няма ні для адной іншай галіны.

Што да ўласна заатэхнікаў і ветэрынараў, сапраўды, патрэба сельскагаспадарчых арганізацый у спецыялістах гэтага профілю застаецца высокай, але не крытычнай. Сістэма падрыхтоўкі кадраў своечасова рэагуе на запыт прадпрыемстваў, і за апошнія два гады выпуск такіх спецыялістаў з каледжаў і ВНУ склаў больш за 2000 чалавек.

Для павышэння матывацыі спецыялістаў асабліва заатэхнічнай і ветэрынарнай службаў, замацавання іх на вытворчасці ў калектыўных дагаворах і палажэннях аб аплаце працы ў сельскагаспадарчых арганізацыях краіны ўстаноўлены выплаты стымуляцыйнага характару да тарыфных акладаў, уключана норма аб аднаразовых выплатах для такіх спецыялістаў і інш.

Увогуле, арганізацыі і прадпрыемствы, якія забяспечваюць дастойныя ўмовы працы, пражывання, узровень заработнай платы, не адчуваюць востры патрэбы ў зааветкадрах.

АСЭНСАВАНЫ ВЫБАР

— Нярэдка даводзіцца чуць ад кіраўнікоў гаспадарак, што выпускнікі сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў слаба падрыхтаваны да работы ў вёсцы...

— Адным з важных кірункаў развіцця аграрнай адукацыі з'яўляецца павышэнне якасці практыкаарыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў. Мінсельгасхарч сумесна з аграрнымі ВНУ і заказчыкамі кадраў вядзе пастаянную работу па абнаўленні вучэбных планаў і праграм, павышэнні прафесійнага ўзроўню педагагічных кадраў, развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, максімальным збліжэнні навучальнага працэсу з вытворчасцю. Практычныя і лабараторныя заняткі, навучальныя і вытворчыя практыкі ў агульным аб'ёме навучальных гадзін на падрыхтоўку спецыялістаў складаюць каля 60—70 працэнтаў.

Студэнты ўжо з першага курса замацоўваюцца за канкрэтнымі сельскагаспадарчымі арганізацыямі (заключаюцца дагаворы), у якіх праходзяць практыкі ў перыяд навучання і ў далейшым працаўладкоўваюцца. Гэта дае магчымасць павысіць якасць практычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў і іх хуткую адаптацыю ў калектыве.

Важным кірункам у рабоце па падрыхтоўцы кадраў і іх замацаванні з'яўляецца мэтавая падрыхтоўка. Арганізацыі — заказчыкі кадраў, якія накіроўваюць абітурыентаў на навучанне па мэтавых дагаворах, устанаўліваюць для іх даплаты да стыпендый на перыяд навучання, удзельнічаюць у іх практычнай падрыхтоўцы ў перыяд праходжання вытворчай і пераддыпломнай практык з наступным выдзяленнем гарантаванага рабочага месца тэрмінам на пяць гадоў. Як паказвае практыка, большасць мэтавікоў застаецца працаваць у арганізацыі.

З 2024 студэнты першага курса замацоўваюцца за канкрэтнымі сельскагаспадарчымі арганізацыямі (заключаюцца дагаворы), у якіх будуць праходзяць практыкі ў перыяд навучання і ў асноўным у далейшым працаўладкоўваюцца. Гэта дасць магчымасць павысіць якасць практычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў і іх хуткую адаптацыю ў калектыве.

— Якое значэнне для прафесійнага станаўлення маладога спецыяліста мае інстытут настаўніцтва?

— Для маладых спецыялістаў у першыя месяцы работы часта вырашальнымі фактарамі з'яўляюцца імкненне ўліцца ў працоўны калектыў і прывыкнуць да новых умоў і рэжыму работы. Але не менш значнай для іх з'яўляецца падтрымка і дапамога з боку больш вопытных работнікаў — настаўнікаў.

Адзначу, што кіраўнікі сельскагаспадарчых арганізацый матывуюць і заахвочваюць імкненне дапамагчы маладым шляхам прэміравання, даплат, надбавак, аднаразовай узнагароды, заключэння кантрактаў на максімальны тэрмін і іншых мерапрыемстваў.

МАГНІТ ДЛЯ ВЫПУСКНІКОЎ

— Ці здараецца такое, што выпускнікі аграрных ВНУ, каледжаў альбо не даязджаюць да месца размеркавання, альбо звальняюцца раней за тэрмін адпрацоўкі?

— Для павышэння прэстыжу працы і матывацыі пражывання ў сельскай мясцовасці ўжо шмат зроблена. У гарадах няма такіх ільготных умоў, якія створаны для спецыялістаў, што пражываюць у сельскай мясцовасці і працуюць у сельскагаспадарчых арганізацыях. Меры, якія прымаюцца, аказваюць станоўчы ўплыў на паляпшэнне сітуацыі з забяспечанасцю кадрамі сельскагаспадарчых арганізацый краіны і далі магчымасць у цэлым стабілізаваць дынаміку замацавання маладых спецыялістаў у галіне.

Трэба адзначыць, што палова выпускнікоў установ аграрнай адукацыі застаецца ў арганізацыях па першым месцы працы, прадстаўленым дзяржавай. Частка, атрымаўшы пэўны досвед, сыходзіць у іншыя арганізацыі АПК, дзе, на іх погляд, больш прывабныя ўмовы працы і побыту — іншыя, на жаль, змяняюць сферу дзейнасці. Асноўнымі прычынамі звальнення, як правіла, з'яўляюцца прызыў на воінскую службу, перавод да іншага наймальніка, змяненне сямейнага становішча.

У аграрных ВНУ існуе кантроль за ходам адпрацоўкі маладым спецыялістам установленага тэрміну абавязковай работы па размеркаванні і забяспечваецца спагнанне сродкаў, выдаткаваных дзяржавай на яго падрыхтоўку, у выпадку неадпрацоўкі гэтага тэрміну. Пераразмеркаванне маладых спецыялістаў ажыццяўляецца толькі па ўзгадненні з раённымі і абласнымі выканаўчымі камітэтамі.

— Якія фактары ўплываюць на замацаванне маладога спецыяліста? Што, на вашу думку, трэба, каб моладзь выбірала і работу, і жыццё ў сельскай мясцовасці?

— Для павышэння прэстыжу работы ў сельскай гаспадарцы на дзяржаўным узроўні рэалізоўваецца шэраг дзяржаўных праграм і мерапрыемстваў, напрамую арыентаваных на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, вытворчага патэнцыялу аграпрамысловага комплексу. Ажыццяўляецца рэканструкцыя і будаўніцтва новых малочнатаварных комплексаў і ферм з высокатэхналагічным абсталяваннем, тэхнічнае перааснашчэнне сельскагаспадарчых арганізацый, якое ўключае абнаўленне тэхнічнага парка і ўвод у эксплуатацыю сучасных гаспадарчых аб'ектаў. Вялікая ўвага надаецца стварэнню камфортнага асяроддзя для жыцця вяскоўцаў, у тым ліку шляхам удасканалення сацыяльнай інфраструктуры сельскіх населеных пунктаў.

Важнай задачай кадравай палітыкі сельскагаспадарчай галіны з'яўляецца прыцягненне ў аграрныя ВНУ прафесійна арыентаваных маладых людзей, якія свядома абралі спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю. Вызначальная роля тут належыць мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў, якая дае магчымасць заказчыку кадраў падабраць сур'ёзна заматываваных абітурыентаў, знаёмых з сельскім укладам жыцця і вытворчасцю, а таксама арганізаваць іх навучанне ва ўмовах рэальнай гаспадаркі, стварацьнеабходныя ўмовы на старце іх вытворчай дзейнасці.

Яшчэ важны момант — для замацавання кадраў дзейнічае шэраг указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада, якія вызначаюць комплекс гарантый і матэрыяльных стымулаў як для абітурыентаў, якія паступаюць у аграрныя ВНУ на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, так і для маладых спецыялістаў: ільготныя ўмовы прыёму на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, маладым спецыялістам — даплаты да заработнай платы на працягу пяці гадоў працы, ільготнае крэдытаванне на будаўніцтва жылля, набыццё маёмасці і тавараў першай неабходнасці.

Акрамя вышэйназваных мер, студэнтам устаноў вышэйшай аграрнай адукацыі з 2021 года дадзена магчымасць праходжання воінскай службы ў рэзерве падчас навучання ў ВНУ ў перыяд летніх канікул, якія затым не прызываюцца на тэрміновую ваенную службу пасля заканчэння ВНУ. Ужо завяршылі праходжанне такой службы 100 студэнтаў, 129 працягваюць такую службу.

Установамі адукацыі падтрымліваецца сувязь з выпускнікамі як мінімум на працягу тэрміну работы па размеркаванні, забяспечваецца суправаджэнне кожнага маладога спецыяліста, аказанне неабходных кансультацыйных паслуг і дапамогі па пытаннях выканання прафесійных абавязкаў, прымянення працоўнага заканадаўства, аплаты працы, забеспячэння жыллём і іншым. Гэта дапамагае маладым спецыялістам хутчэй адаптавацца і замацавацца на вытворчасці.

— Але не ўсе выпускнікі ўстаноў адукацыі размяркоўваюцца ў моцныя гаспадаркі, якія ім даюць жыллё і практычна ўсе даброты гарадской цывілізацыі. Ёсць гаспадаркі і куды больш сціплыя...

— Размеркаванне арганізавана з улікам патрэб у кадрах, у першачарговым парадку ў арганізацыі аграпрамысловага комплексу, якія прапануюць больш высокі ўзровень заработнай платы і выдзяляюць добраўпарадкаванае жыллё.

Мінсельгасхарчам, аблсельгасхарчамі, райсельгасхарчамі, аграрнымі ВНУ на пастаяннай аснове вядзецца работа па вывучэнні праблем маладых спецыялістаў, у тым ліку па задавальненні ўмовамі працы і пражывання з мэтай прыняцця адпаведных мер па вырашэнні выяўленых праблемных пытанняў.

Алена ВІНАГРАДАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Эканоміка

ВУП плюсуе з паскоранымі тэмпамі

Міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР пракаментаваў вынікі работы эканомікі краіны ў студзені — кастрычніку

Ён адзначыў, што ўжо ёсць звесткі за 10 месяцаў гэтага года. «У прынцыпе, усё ў рамках прагнозных параметраў. ВУП у студзені — кастрычніку вырас на 4,2 %. Нагадаю, што задача па годзе ў нас 3,8 %. Дынамічна развіваюцца і даюць асноўны ўклад у развіццё эканомікі такія галіны, як прамысловасць, будаўніцтва і сельская гаспадарка. Акрамя таго, за 10 месяцаў мы выйшлі на ўзровень мінулага года па будаўніцтве жылля і ўжо бачым, што выканаем задачу праграмнага дакумента», — распавёў міністр.

Рэальныя даходы насельніцтва, дзякуючы ў тым ліку і развіццю прамысловасці, сельскай гаспадаркі, падтрымліваюцца сёння на высокім узроўні — у студзені — верасні яны выраслі на 9,4 %. «Гэта дае нам магчымасць развіваць і наш рознічны тавараабарот, які за 10 месяцаў вырас амаль на 12 %. Мы бачым даволі вялікі попыт на нашы айчынныя тавары — легкавыя аўтамабілі і іншую тэхніку», — адзначыў міністр.

Што датычыцца будаўнічай галіны, тут у нашай краіне за студзень — кастрычнік арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 30,4 тысячы кватэр, уведзена ў эксплуатацыю 2980,1 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля.

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 992,5 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 33,3 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля.

З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 631,6 тысячы квадратных метраў.

У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 1122 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 37,6 % ад агульнага ўводу па краіне.

Самы высокі тэмп росту па будаўніцтве агульнай плошчы жылля адзначаны ў Гродзенскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцях. Па будаўніцтве жылля для маючых патрэбу з дзяржаўнай падтрымкай са станоўчай дынамікай спрацавала і Віцебская вобласць (135 %).

Таксама ў эксплуатацыю ўведзена 266,1 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы арэндnага жылля, 1399,3 тысячы квадратных метраў індывідуальнага жылля. Для шматдзетных сем'яў пабудавана больш за 4,4 тысячы кватэр (84,6 % ад гадавога задання). Найлепшыя паказчыкі тут забяспечылі Брэсцкая і Віцебская вобласці.

Акрамя таго, на пасяджэнні калегіі Мінбудархітэктуры адзначалася, што ў студзені — верасні экспарт будаўнічых, інжынерных і архітэктурных паслуг склаў 580,8 мільёна долараў. Са станоўчым вынікам спрацавалі практычна ўсе рэгіёны краіны. Асноўным партнёрам застаецца Расія, яе доля складае 80 %. Узаемадзеянне наладжана з 70 рэгіёнамі партнёра. У найбліжэйшай перспектыве — развіццё экспарту ў краіны далёкай дугі, у тым ліку ў краіны Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Сяргей КУРКАЧ.

Навуку — у жыццё

ДЗЕ ШУКАЦЬ КРЫНІЦУ ЗДАРОЎЯ І ДАЎГАЛЕЦЦЯ

Праграму якаснага харчавання распрацавалі ў Гродзенскім аграрным універсітэце

Амаль 40 гадоў прысвяціў гэтай тэме доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Аляксандр АЎТКА. У яго багажы — некалькі дзясяткаў кніг, у якіх расказваецца, што аснову правільнага рацыёну складае агародніна. Свае напрацоўкі заслужаны дзеяч навукі Беларусі адлюстраваў у панарамным стэндзе, які папулярна інфармуе аб каштоўнасці кожнага віду агародніны, іх уплыве на арганізм, наяўнасці нітратаў, спосабаў іх нейтралізацыі. Увогуле, аб усім тым, што садзейнічае правільным харчовым звычкам і здаровому ладу жыцця.

Мы сустрэліся з прафесарам якраз перад яго ад'ездам у Мінск на ўрачыстасць, прысвечаную Дню работнікаў сельскай гаспадаркі, дзе знакамітага навукоўца, двойчы лаўрэата прэміі НАН Беларусі, члена міжнародных акадэмій чакала чарговае ўшанаванне — занясенне на Дошку гонару галіновага міністэрства. Зразумела, што словы такога аўтарытэтнага знаўцы нават у асабістым плане ўспрымаліся як кіраўніцтва да новага светапогляду на праблему харчавання. А пераглядзець свае пазіцыі яшчэ як варта, асабліва ў святле новых ведаў. Як аказалася, «несвядомых» спажыўцоў, падобных журналісту «Звязды», даволі шмат.

— У нас досыць паспяхова развіваецца агародніцтва, ствараюцца новыя тэхналогіі, тэхнічныя прылады. Вытворчасць «раскручваецца», вырошчваецца да шасці дзясяткаў відаў культур, а вось харчаванне затрымліваецца. Насельніцтва не задумваецца пра важнасць спажывання агародніны. Таму цяпер я сваю задачу бачу ў тым, каб як мага больш папулярызаваць нашы сельскагаспадарчыя культуры, у першую чаргу сярод моладзі, — такімі словамі пачаў наш дыялог Аляксандр Аўтка.

Прафесар звяртае ўвагу на такі аспект, як сучаснае харчаванне. Моладзь у сваёй большасці аддае перавагу фаст-фудам, якія шырока рэкламуюцца. А між тым іх кошт значна вышэйшы ў адрозненні ад айчыннай агародніны. Таму цяпер варта мяняць менавіта ідэалогію спажывання і ў гэтым кірунку выхоўваць маладое пакаленне. Паводле інфармацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, менавіта ад харчавання залежыць 80 % здароўя чалавека. А краіна павінна быць зацікаўлена ў выхаванні здаровай нацыі.

— Мы распрацавалі такую панараму, якая наглядна дэманструе ўсе аспекты ўжывання садавіны і агародніны. Часткова гэта выкарыстоўваецца ў гродзенскіх школах, у аграрным універсітэце. Нядаўна мы зрабілі такую прэзентацыю для выкладчыкаў нашай навучальнай установы, цяпер рыхтуемся правесці яе ў школах, — тлумачыць Аляксандр Аляксандравіч.

Мы падыходзім да маштабнай панарамы, што размешчана ў холе Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта. Яна складаецца з шэрагу раздзелаў, якія аб'яднаны агульнай сістэмай здаровага рацыёну на аснове агародніны. Інфармацыя пададзена ў даступнай і наглядной форме. Суразмоўнік звяртае ўвагу на лекавыя якасці агародніны. Напрыклад, хто ведае, што яна садзейнічае засвойванню іншых прадуктаў харчавання дзякуючы высокаму ўтрыманню прыроднай структураванай вадкасці?

— Кожная культура карысная па-свойму. Высокія антыбактэрыяльныя якасці маюць часнок, цыбуля, хрэн, бурак, пятрушка, пастэрнак, чорная рэдзька. Вельмі карысны дайкон, які спрыяе выведу цяжкіх металаў з арганізма. Хачу адзначыць асобныя якасці квашанай капусты, гэты прадукт як ніякі іншы, зніжае ўзровень халестэрыну. Карысныя цукаты з морквы, гарбуза, бурака. Яны падтрымліваюць у норме гемаглабін, стымулююць імунную сістэму, запускаюць працэс амаладжэння і рэгенерацыі. Вялікае ўтрыманне клятчаткі садзейнічае наладжванню страўнікавых працэсаў, пазбаўляе ад шлакаў. Карысныя сокі з агародніны, якія можна ўжываць штодзённа альбо курсамі. Увогуле рэкамендуецца за адзін прыём з'есці 400-500 грамаў агародніны, — канстатуе суразмоўнік.

Што яшчэ важна. Напрыклад, для таго каб ежа засвойвалася, павінен быць добры эмацыянальны стан. Калі чалавек агрэсіўны, злы, у стрэсавым стане, мозг не дае каманды на якаснае спажыванне, і арганізм не атрымлівае патрэбнай колькасці карысных рэчываў. Пры гэтым есці трэба моўчкі. Таксама не трэба забываць аб вельмі доўгім перажоўванні ежы. Кажуць: хто доўга жуе, той доўга жыве. Варта памятаць, што ежа не павінна быць занадта гарачай, а толькі цёплай. Пасля яды не варта спажываць многа вадкасці, бо ў страўніку выпрацоўваюцца ферменты, а вадкасць змывае ўсё гэта, працэс зацягваецца, і тады ежа не такая карысная.

Па меры знаёмства з панарамным стэндам прыходзіць разуменне, наколькі важна ўсвядоміць гэту інфармацыю. Хіба многія з нас надаюць значэнне эмацыянальнаму стану падчас прыёму ежы? Наадварот, некаторыя прывыклі менавіта «заядаць» стрэс. Аказваецца, такі падыход толькі шкодзіць арганізму. А звыклая фраза пра неабходнасць захоўвання кіслотна-шчолачнага балансу ці гаворыць нам аб чым-небудзь?

А між тым гэты самы баланс — аснова харчавання. Ёсць навуковая тэорыя, што ў шчолачным асяроддзі не развіваюцца шкодныя клеткі, у тым ліку ракавыя. Менавіта агародніна і стварае шчолачнае асяроддзе, таму яе ўжыванне неабходна для здароўя.

Канон харчавання такі: сняданак 30 % агульнага аб'ёму ежы ў дзень, абед — 45 % і вячэра — 25 %. Інтэрвал паміж прыёмамі — чатыры гадзіны. Перакусамі лепш не злоўжываць, бо арганізму таксама трэба адпачываць. Неабходна ведаць і аб сумяшчальных і несумяшчальных прадуктах. Напрыклад, бялкі і вугляводы нельга ўжываць разам, а толькі паасобку з агароднінай.

Ёсць на панарамным стэндзе і раздзел, які прысвечаны нітратам.

— У свой час мне прыйшлося вызначыць утрыманне нітратаў у кожным відзе агародніны. Гэта таксама важна ведаць пры спажыванні, — расказвае суразмоўнік. — Напрыклад, у таматах іх няшмат, а вось у агурочнай скурцы 150 міліграмаў, мякаці — 38. Значыць, варта агурочную скурку зразаць, як і кончык. У морквы чым менш асяродак, тым яна карысней. У кабачка таксама трэба чысціць скурку. Варта ведаць, як прымяняць агародніну. Напрыклад, квашаная, салёная і кансерваваная зніжае ўтрыманне нітратаў на 60 %. Нітраты зніжаюцца пры мыцці, ачыстцы і варцы. Разам з тым варта рабіць акцэнт на спажыванне сырой агародніны.

У сувязі з гэтым Аляксандр Аўтка заўважае, што сёння ўдзяляецца ўвага экалагічнаму земляробству, у ходзе якога часткова зніжаецца прымяненне пестыцыдаў. Напрацоўкі ўвайшлі ў новую кнігу «Аб здаровай глебе». Кажа, што спецыялісты-аграрнікі ўжо называюць яе «бібліяй агранома».

На чарзе — новае выданне важкага тома «Агародніна — крыніца здароўя і даўгалецця». Пакуль выйшаў першы экзэмпляр. У найбліжэйшы час адбудзецца яго прэзентацыя ў Гродзенскім аграрным універсітэце. На думку Аляксандра Аўткі, асветніцкую дзейнасць у плане здаровага харчавання трэба пачынаць са школы. Першай установай, дзе з'явяцца адпаведныя інфармацыйныя стэнды, стане сталовая СШ № 42 горада Гродна. Серыя плакатаў, якая распрацавана прафесарам, выканана ў яркай каляровай гаме, дзе да кожнага віду агародніны ёсць свой афарызм.

У перспектыве арганізатары праекта плануюць праводзіць трэнінгі сярод педагогаў, каб тыя ў даступнай форме расказвалі дзецям аб карысці агародніны. Гэта дапаможа сфарміраваць здаровыя харчовыя звычкі маладога пакалення.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

Кадры на сяле

ГАЛОЎНЫ АГРАНОМ НАСТАССЯ

Малады спецыяліст — пра свядомы выбар прафесіі і намер прысвяціць сябе рабоце ў сельскай гаспадарцы

Настасся КАРЭНЬКА летась атрымала дыплом Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і прыйшла працаваць у ААТ «Пакроўскае» Кобрынскага раёна аграномам. А нядаўна ёй даверылі пасаду галоўнага спецыяліста галіны раслінаводства з адпаведным узроўнем адказнасці. І цяпер усё часцей да яе звяртаюцца «Настасся Сяргееўна». Але аб усім па парадку.

Насця нарадзілася і вырасла ў вёсцы Навасёлкі Кобрынскага раёна. Яе мама, работнік культуры, брала з сабой дачушку на самыя розныя мерапрыемствы. А тая з маленства паказвала задаткі талентаў — упэўнены прыгожы голас, выразная дыкцыя, да таго ж дзяўчына спявае, іграе на гітары і баяне. Маці спадзявалася, што дачка працягне яе справу. Тым больш што адна са старэйшых дачок скончыла мастацкі каледж і працуе ў гэтай сферы. А малодшая — нечакана для ўсёй сям'і пайшла вучыцца на... аграномa.

Пасля заканчэння ВНУ ў дзяўчыны была магчымасць уладкавацца ў гаспадарцы па месцы жыхарства, але яна вырашыла пачынаць працоўную дзейнасць на новым месцы. Прапанавалі «Пакроўскае»... Да работы прыступіла, калі сельгаспрадпрыемства актыўна займалася ўборкай. Цікаўлюся ў маладога спецыяліста, што было самым складаным у першыя дні самастойнай працы. Пасля кароткага роздуму адказвае, што нялёгка было запомніць усіх працаўнікоў па імёнах, прозвішчах, што з'яўляецца неабходнай умовай для наладжвання кантакту з людзьмі. Сапраўды, пачынаць працоўную дзейнасць маладому аграному давялося не ў кабінеце, а ў полі.

Настасся КАРЭНЬКА аглядае ўсходы азімага рапсу.

Работа, варта сказаць, не кожнаму з цяперашняй моладзі будзе пад сілу. Хоць бы таму, што ў гарачую пару рабочы дзень агранома нярэдка пачынаецца ў пяць раніцы, а заканчваецца ў прыцемках. І так кожны дзень, і без усялякіх выхадных. Але Настасся не скардзіцца, гаворыць коратка: «Прывыкла». Кажа яшчэ пра тое, што ёй вельмі пашанцавала з калектывам. Сапраўды, уяўляецца важным, калі на першым этапе падтрымаюць, падкажуць, накіруюць. За гэта малады спецыяліст удзячная не толькі кіраўніку, калегам, але і многім працаўнікам гаспадаркі. «У нас ёсць такія механізатары-асы, якія і мяне многаму навучаць», — заўважае аграном.

— Спачатку старалася ва ўсё ўнікаць, усяму вучыцца, было непрывычна, часам страшнавата, а потым неяк усё стала выраўноўвацца, — разважае дзяўчына, — і работа пачала прыносіць задавальненне. Напрыклад, калі ўсё ўбралі чысценька, ніводнага каласка не засталося. І асаблівая радасць глядзець, як пасевы падымаюцца, набіраюць сілу, і адчуваць, што ты маеш да гэтага дачыненне, што па тваім раскладзе сюды былі ўнесены неабходныя ўгнаенні, праведзены догляд раслін, ты ўсё кантралюеш, сочыш за гэтым, назіраеш. Мне падабаецца, адчуваю, што гэта вось маё, — гаворыць Настасся Карэнька.

Цікаўлюся, як за год работы з радавога агранома «падрасці» да галоўнага. На што дзяўчына вельмі сур'ёзна адказвае, што гэта, хутчэй, збег абставін: «Так сталася, што мая папярэдніца звольнілася, і з'явілася вакансія. Я лічу, што яшчэ не гатовая да такой пасады, але калі давер аказалі, то мусіш адпавядаць. Ці хоць бы імкнуцца да гэтага. Ну і надзвычай важная падтрымка дырэктара гаспадаркі, аграномa па спецыяльнасці, старэйшых калег».

Малады спецыяліст здымае кватэру ў суседнім населеным пункце. Палову кошту аплачвае гаспадарка. Ёсць у сельгаспрадпрыемстве і свабодныя дамы, але пакуль адна, без сям'і, Настасся не імкнецца атрымаць цэлы дом, кажа, што зручна было б жыць у невялікай кватэры. І такая перспектыва выглядае рэальнай: гаспадарка дабудоўвае шматкватэрны дом. Там неўзабаве можа атрымаць кватэру і галоўны аграном.

Рабочы дзень у спецыяліста пачынаецца ў 7.30. Цяпер часцей выпадае бываць у бацькоў. Яны па-ранейшаму шкадуюць дачушку, што выбрала такую складаную работу. Але яна разглядае сваю будучыню, звязаную менавіта з агранамічнай спецыяльнасцю.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
фота аўтара.
Кобрынскі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

20 лістапада 2024 г. № 44 (777)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

«РАБОТА З НАСЕЛЬНІЦТВАМ ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ АКТУАЛЬНАЙ»

У гарадскім пасёлку Шуміліна прайшло пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі на тэму «Аб рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Віцебскай вобласці» па выніках адзінага дня прыёму грамадзян сенатарамі ў паўночным рэгіёне.

Фота БелТА.

Тэндэнцыя зніжэння

Як адзначыў у сваім дакладзе **загадчык аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і ўнутраным кантролі Сакратарыята Савета Рэспублікі Максім ШЭКО**, сёлета ад жыхароў Віцебскай вобласці ў Савет Рэспублікі з пачатку года паступіла 565 зваротаў, што амаль на 19 працэнтаў менш, чым у 2022 годзе. «З 2023 года назіраецца тэндэнцыя росту колькасці зваротаў ад Віцебскага рэгіёна: у Савет Рэспублікі — на 4 працэнты, выканкамы — амаль на 10 працэнтаў, а ў аблвыканкам — на 21 працэнт», — сказаў Максім Шэко.

Ён падкрэсліў, што ад жыхароў паўночнага рэгіёна паступалі звароты ў асноўным па тых жа пытаннях, што і ў іншых абласцях краіны. Найбольшая колькасць з іх датычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта, напрыклад, факты залівання жылога памяшкання, няправільнага налічэння платы за водазабеспячэнне. Вырашыць асобныя сітуацыі членам Савета Рэспублікі ўдаецца, забяспечыўшы ўзаемадзеянне рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржкіравання.

За апошнія два гады на Віцебшчыне на 30 працэнтаў выросла колькасць калектыўных зваротаў у Савет Рэспублікі. Акрамя таго, амаль кожны пяты з агульнай колькасці зваротаў — паўторны. Наталля Качанава катэгарычна адзначыла, што такога быць не павінна, і ў гэтым пытанні трэба працаваць на апераджэнне.

Кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ расказаў, што ў вобласці дэпутатам усіх узроўняў з пачатку года паступіла больш за 9 тысяч зваротаў, звыш 90 працэнтаў з іх разгледжана і па іх прыняты станоўчыя рашэнні. Па астатніх пытаннях дадзены тлумачэнні, асобныя ўзятыя на кантроль. «Сённяшняе пасяджэнне паказвае, наколькі важная і значная гэтая праца. Звароты грамадзян служаць для нас адпраўным пунктам у фарміраванні планаў па развіцці сацыяльнай сферы, правядзенні работ у сферы ЖКГ, дарожнага забеспячэння, транспартнага абслугоўвання. Любая сфера дзейнасці падсілкоўваецца той інфармацыяй, якую мы атрымліваем ад насельніцтва», — падкрэсліў Дзмітрый Уладзіміравіч.

ЖКГ, вада, ахова здароўя

З дакладам аб выніках работы са зваротамі грамадзян выступіў **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў ДУРНОЎ**. Так, на пачатак кастрычніка 2024 года ў Віцебскай вобласці пасля правядзення капітальнага рамонту жылых дамоў уведзена ў эксплуатацыю больш за 300 тысяч квадратных метраў. Заменена 38 ліфтаў, праведзены бягучы рамонт дахаў на 143 тысячах квадратных метраў. З мэтай забеспячэння жыхароў рэгіёна якаснай пітной вадой у вобласці запланавана будаўніцтва 41 станцыі абезжалезвання, ужо ўведзена ў эксплуатацыю 27 станцый.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Задача парламентарыяў — бачыць і дапамагаць

У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з маці, якія выхоўваюць інвалідаў з дзяцінства.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел міністр аховы здароўя Аляксандр Хаджаеў, міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля Паўлючэнка, першы намеснік міністра юстыцыі Наталля Філіпава, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей Сівец.

«Сёння я вас запрасіла для таго, каб па выніках праведзенага прыёму па асабістых пытаннях у Віцебскай вобласці разгледзець узнятыя, на мой погляд прававерныя, прапановы. Вы вывучыце ўсе дзейныя нарматыўныя прававыя акты і дакладна ўнікнеце ў гэта больш глыбока», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі, звярнуўшыся да экспертаў.

Выслухаўшы адну з заяўніц падчас асабістага прыёму ў Расонах, Наталля Качанава прыняла рашэнне больш прадметна абмеркаваць пытанні, агучаныя жанчынай, якая прыехала на прыём з Рэчыцы. Разам з ёй на сустрэчы ў Савеце Рэспублікі — мінчанка, якую хвалююць тыя ж праблемы.

Заяўніцы, аб'яднаныя агульнай бядой, прыйшлі ў Савет Рэспублікі з канкрэтнымі прапановамі, якія датычацца перагляду парадку выплаты дапамог сем'ям з паўналетнімі дзецьмі-інвалідамі; інструкцыі аб парадку накіравання пацыентаў для атрымання медыцынскай дапамогі ў арганізацыі аховы здароўя з магчымасцю шпіталізацыі сумесна з бацькамі; давання бальнічных лістоў для бацькоў дзяцей-інвалідаў на перыяд санаторна-курортнага лячэння і рэабілітацыі.

Пытанні застаюцца на кантролі Савета Рэспублікі.

Фактар незалежнасці

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей СІВЕЦ узяў удзел у адкрыцці VII Міжнароднага навукова-тэхнічнага форуму па хімічных тэхналогіях і нафтагазаперапрацоўцы («НАФТАГАЗАХІМІЯ-2024»), які адбыўся ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».

Форум сабраў на сваёй пляцоўцы вядучых вучоных і распрацоўшчыкаў, прадстаўнікоў дзелавой і экспертнай супольнасці Рэспублікі Беларусь і замежных дзяржаў.

Падчас урачыстай цырымоніі сенатар зачытаў прывітальны адрас ад імя Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі Качанавай.

Прагучалі таксама прывітальныя словы ад кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і ганаровых гасцей. Удзельнікі мерапрыемства падкрэслілі, што дынамічнае развіццё нафтахімічнай галіны і генерацыя новых тэхналогій — найважнейшая канкурэнтная перавага і фактар незалежнасці краіны.

Падчас наведвання ВНУ парламентарый абмеркаваў з кіраўніцтвам Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта далейшыя перспектывы і кірункі развіцця ўстановы адукацыі.

У той жа дзень словы прывітання ад імя Старшыні Савета Рэспублікі гучалі і ў адрас удзельнікаў XI з'езда педыятраў і II Перынатальнага кангрэсу Беларусі, прымеркаваных да 60-годдзя педыятрычнага факультэта БДМУ. Іх агучыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына АБЕЛЬСКАЯ**.

Мерапрыемства сабрала вядучых спецыялістаў Беларусі, Расіі, краін блізкага і далёкага замежжа. Гэта педыятры, неанатолагі, дзіцячыя хірургі, анестэзіёлагі-рэаніматолагі, акушэры-гінеколагі. У прэзідыуме — міністр аховы здароўя Аляксандр Хаджаеў, рэктар БДМУ Сяргей Рубнікоўіч, кіраўнікі вядучых навукова-практычных цэнтраў.

«РАБОТА З НАСЕЛЬНІЦТВАМ ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ АКТУАЛЬНАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

На пастаянным кантролі мясцовых органаў улады знаходзяцца пытанні якасці гандлёвага абслугоўвання сельскага насельніцтва. У рамках рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 309 Віцебскаму аблспажыўтаварыству далі крэдыт у памеры 4,1 мільёна рублёў для разліку з беларускімі вытворцамі, набыты 33 сучасныя аўтакрамы. У сферы архітэктуры і будаўніцтва адзначаецца актыўнасць грамадзян у абмеркаванні планаў горадабудаўніцтва, усе звароты па гэтым пытанні ўлічваюцца пры правядзенні грамадскіх абмеркаванняў.

«Важнай тэмай для насельніцтва з'яўляецца работа сістэмы аховы здароўя. Так, за апошнія тры гады павялічаны набор навучэнцаў у медыцынскія каледжы, штогод заключаюцца дагаворы на мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў. У Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце адкрыты педыятрычны факультэт і адноўлены набор беларускіх студэнтаў на стаматалагічны факультэт на бюджэтнай аснове. З мэтай замацавання медыцынскіх кадраў ва ўстановах аховы здароўя для ўсіх, хто мае патрэбу, дадзены месцы ў інтэрнатах і арэнднае жыллё. Арганізаваны выезды супрацоўнікаў гарадскіх і абласных устаноў аховы здароўя, клінічных кафедраў ВДМУ ў рэгіёны. У сельскай мясцовасці актыўна развіваецца мабільная медыцына, павысілася даступнасць аказання высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі ў сувязі з прамой дастаўкай пацыентаў па паказаннях у міжраённыя цэнтры. У 2024 годзе ідзе ўстаноўка двух новых магнітна-рэзанансных тамографаў, у 2025 годзе запланавана ўстанавіць яшчэ тры апараты МРТ. Ажыццяўляецца дыстанцыйнае кансультаванне», — расказаў Вячаслаў Дурноў.

Праблемныя моманты ў рабоце са зваротамі грамадзян ёсць у Аршанскім раёне. «У Аршанскі райвыканкам за дзесяць месяцаў бягучага года паступіла 1628 зваротаў, у Аршанскі раённы Савет дэпутатаў — 104 звароты. З вышэйстаячых арганізацый паступіў 131 зварот, у параўнанні з аналагічным перыядам 2023 года рост склаў 52 працэнты. За бягучы перыяд адзначаецца зніжэнне колькасці калектыўных зваротаў на 10 працэнтаў, аднак павялічваецца колькасць паўторных зваротаў. Іх змест паказвае, што пераважна гэта не пытанні глабальнага характару, якія патрабуюць вялікіх фінансавых затрат, а лакальныя праблемы, што павінны быць вырашаны ў кароткія тэрміны. Улічваючы, што большасць пытанняў паступае па рабоце ЖКГ і стане дарог,

Фота ТК Савета Рэспублікі.

Аршанскім райвыканкамам прыняты адпаведныя меры: назначана новае кіраўніцтва КУП «Оршакамгас» і Аршанскай спецаўтабазы», — расказала **старшыня Аршанскага раённага Савета дэпутатаў Іна ХАМУТОЎСКАЯ**, падкрэсліўшы, што дэпутацкі корпус раёна выпрацоўвае новыя формы і метады работы з насельніцтвам.

Узаемадзеянне на ўсіх узроўнях

Падводзячы вынікі пашыранага пасяджэння Прэзідыума, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што Віцебскую вобласць можна вывесці ў лідары, калі працаваць эфектыўна і супольна. Яна яшчэ раз напомніла ўдзельнікам пасяджэння, што ў рабоце не павінна быць фармалізму. «Тое, як кіраўнік працуе з людзьмі і як людзі ўспрымаюць яго працу, адбіваецца на іміджы ўсёй улады нашай краіны. На гэтым Прэзідэнт акцэнтаваў асаблівую ўвагу. Работа з насельніцтвам была і заўсёды будзе актуальнай, таму што палітыка, якая праводзіцца ў краіне, накіравана на паляпшэнне дабрабыту нашых грамадзян. Недапушчальна, калі кіраўніцтва выканаўчых камітэтаў і адказных служб можа адказваць па-хамску. Кожны з вас павінен быць псіхолагам, праяўляць павагу і быць тактычным у зносінах з кожным чалавекам, які звярнуўся па дапамогу. Недарэмна Прэзідэнт гаварыў, што часам чалавеку патрэбна не фізічная дапамога, а быць пачутым. Памятайце, што людзей нельга адштурхоўваць. Не ў вашай кампетэнцыі вырашыць праблему — звярніцеся да нас. Калі зварот правамерны, мы акажам дапамогу агульнымі сіламі», — адзначыла спікер.

Па словах Наталлі Качанавай, апошнім часам вакол Беларусі складваецца няпростая абстаноўка. «Усё, што накіравана супраць нашай краіны, — і санкцыйны ціск, і гібрыдная вайна, — гэта ў поўнай меры не сціхла. Гэта не сышло кудысьці», — сказала яна. Менавіта таму народу варта згуртавацца і разам вырашаць пытанні і праблемы, якія ўзнікаюць.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што ўзаемадзеянне павінна быць наладжана на ўсіх узроўнях улады і паміж міністэрствамі, ведамствамі. Наталля Іванаўна расказала, як важна, каб моладзь і кваліфікаваныя спецыялісты заставаліся ў рэгіёнах. І для гэтага неабходна стварыць спрыяльныя ўмовы. Таксама варта выкарыстоўваць і існы патэнцыял кожнага рэгіёна. Спікер падкрэсліла, што любыя пытанні і праблемы можна вырашыць разам, прыцягваючы насельніцтва, прадпрыемствы, бізнес, каб палепшыць жыццё ў рэгіёне, і пры гэтым важна захаваць мір у краіне. «Тут трэба працаваць эфектыўна. Трэба працаваць так, каб усе задачы, якія перад намі пастаўлены, былі выкананы. Калі гэта праваахоўнікі, то трэба не дапусціць парушэння правапарадку, таму што брэнд нашай краіны — гэта спакой», — заключыла Наталля Качанава.

Фота БелТА.

Камфорт для маладых і старых

У гэты дзень Старшыня Савета Рэспублікі і кіраўніцтва Віцебскай вобласці ўзялі ўдзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця аддзялення сястрынскага догляду Шумілінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Аддзяленне сястрынскага догляду з'явілася замест двух іншых аддзяленняў, дзе пасля рамонту ЦРБ вызваліліся памяшканні. Цяпер тут аказваюць дапамогу адзінока пражываючым і пажылым грамадзянам, якія часткова або цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння, маюць вялікую колькасць захворванняў. Аддзяленне сястрынскага догляду размяшчаецца ў корпусе кругласутачнага стацыянара, побач знаходзіцца аддзяленне, дзе пастаяльцам па неабходнасці можна хутка, якасна і кваліфікавана аказаць медыцынскую дапамогу.

«Аддзяленне разлічана на 32 месцы, цяпер тут размяшчаюцца 20 пацыентаў. Самаму старэйшаму пастаяльцу 88 гадоў. Да гэтага ў раёне былі дзве бальніцы сястрынскага догляду ў Обалі і Нікалаеве. Цяпер для пацыентаў створаны камфортныя ўмовы знаходжання ў ЦРБ. За апошнія тры гады ў нашай бальніцы ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база. У 2021 годзе цалкам адрамантавана цэнтральная раённая паліклініка. Рамонтныя работы закранулі тэрапеўтычнае, рэанімацыйнае, аддзяленне неўралогіі, установа папоўнілася новым абсталяваннем. У планах на 2025 год у нас рамонт педыятрычнага аддзялення», — паведаміла **галоўны ўрач Шумілінскай ЦРБ Святлана ЛІНКЕВІЧ**.

Ганаровыя госці азнаёміліся з матэрыяльна-тэхнічнай базай новага аддзялення, а таксама паразмаўлялі з яго пажылымі пастаяльцамі. Многія з тых пажылых грамадзян, з якімі сустрэлася Наталля Качанава, дзякавалі дзяржаве за магчымасць правесці старасць у камфорце і кваліфікаваным доглядзе. Таксама Старшыня Савета Рэспублікі правяла сустрэчу з калектывам аддзялення сястрынскага догляду, падчас якой прысутныя задавалі пытанні. Так, адна работніца папрасіла разгледзець на заканадаўчым узроўні магчымасць адтэрміноўкі ад службы ў арміі для маладых спецыялістаў-медыкаў. «У нашым калектыве, на шчасце, даволі шмат маладых спецыялістаў. Аднак некалькі разоў мы сутыкнуліся з праблемай, калі нашы хлопцы прыходзяць на работу пасля заканчэння медкаледжа, паступаюць ва ўніверсітэт для атрымання медыцынскай вышэйшай адукацыі — і іх выклікаюць для праходжання службы па ўзросце. Я лічу, што, безумоўна, кожны малады чалавек павінен аддаць доўг Радзіме, але, калі ласка, можна зрабіць гэта пасля атрымання вышэйшай адукацыі?» — спытала жанчына. Наталля Іванаўна паабяцала разгледзець пытанне і падкрэсліла, што такі высокі паказчык замацавання маладых спецыялістаў у ЦРБ дарагога варты. Гэта значыць, што кіраўніцтва раёна стварае камфортныя ўмовы для таго, каб жыць і будаваць сем'і ў сельскай мясцовасці.

Напрыканцы сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі ўручыла кіраўніку Шумілінскай ЦРБ сертыфікат на стаматалагічную ўстаноўку з мэтай павышэння якасці паслуг насельніцтву.

Фінальным пунктам рабочага візіту кіраўніцтва і членаў Савета Рэспублікі ў Шуміліна стала наведванне мемарыяла на брацкіх могілках у цэнтры гарадскога пасёлка. Удзельнікі мерапрыемства хвілінай маўчання ўшанавалі памяць герояў-вызваліцеляў і ўсклалі кветкі да Вечнага агню.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

г. п. Шуміліна.

НОВЫ АСФАЛЬТ І МІНІ-ПАРК АД ФЕРМЕРА

Як у Буховіцкім сельсавеце вырашаюць пытанні добраўпарадкавання

Буховіцкі сельсавет самы вялікі ў Кобрынскім раёне. У яго склад уваходзяць 23 населеныя пункты, дзе пражывае больш чым 5400 чалавек. Тут ёсць дзе працаваць людзям. На тэрыторыі знаходзяцца два паспяховыя сельгаспрадпрыемствы — ААТ «Пакроўскі» і ААТ «Агра-Кобрынскае», а таксама будаўнічая МПК, лясніцтва, шэраг фермерскіх гаспадарак. Людзі актыўна займаюцца падсобнай гаспадаркай.

Новы знешні выгляд вёскі Стрыі

Старшыня сельскага Савета Таццяна БІЧ гаворыць, што ў вёсках сельсавета даволі добра развітая інфраструктура. Працуюць шэсць установ адукацыі, пяць устаноў аховы здароўя, два дамы культуры з бібліятэкамі. Гандаль прадстаўлены трыма крамамі райспажыўтаварыства і сямю прыватнымі магазінамі. Адным словам, ёсць усё для камфортнага жыцця вяскоўца.

І вядома ж, павінна быць для падтрымання парадку на такой вялікай тэрыторыі пастаянная карпатлівая работа. Старшыня сельвыканкама расказала, што работай на пастаяннай аснове займаюцца тры чалавекі, у тым ліку ад раённай службы занятасці. Так што падкошванне, прыборка вуліц і тэрыторый, іншыя неабходныя паўсядзённыя работы вядуцца пастаянна, асабліва ў буйных населеных пунктах.

Таццяна Мікалаеўна працуе кіраўніком мясцовай улады першае скліканне. Паводле яе слоў, з самага пачатку вырашыла ўдзяліць асаблівую ўвагу пытанням добраўпарадкавання невялікіх вёсак, такіх як, напрыклад, Стрыі.

Цэнтральная вуліца вёскі — Новая — за апошнія паўгода карэнным чынам памяняла сваё аблічча. Справа ў тым, што ўздоўж вуліцы раслі старыя векавыя дрэвы, якія з-за ўзросту сталі ўяўляць сабой пагрозу, асабліва ў неспрыяльнае надвор'е. Акрамя таго, побач з дрэвамі разраслося кустоўе, якое шмат гадоў ніхто толкам не прыбіраў. Вось гэтыя дрэвы ўвосень спілавалі, расчысцілі астатнюю лішнюю расліннасць. «І адразу сталі праглядацца вуліца, скрыжаванні — зусім іншы выгляд займела вёска. Асабліва гэта стане прыкметна вясною, калі ўсё зазелянее, — гаворыць старшыня сельвыканкама. — Акрамя таго, на вясковай вуліцы замянілі асфальт, падыходзіць да завяршэння работа па замене двух прыпыначных пунктаў. Такім чынам, Стрыі набываюць аблічча сучаснай, няхай і невялікай, але дагледжанай вёскі».

Калі шанцуе са старастам

У Стрыях першага, каго мы сустрэлі на вуліцы, быў староста вёскі Сяргей Юцык. Засталі яго за работай. Сяргей спілоўваў галіны з паваленых спецыялістамі дрэў. Сяргей Юцык расказаў, што ў Стрыях з насельніцтвам 118 чалавек пражывае некалькі шматдзетных сем'яў. «У адной зарэгістравана 19 чалавек. Я паставіў сабе задачу прыцягнуць і іх да работы па добраўпарадкаванні. Не заўсёды атрымліваецца дасягнуць паразумення, але на суботнік па навядзенні парадку не так даўно выйшла адна такая сям'я. Спадзяюся, што і астатніх удасца сагітаваць на ўдзел у грамадска-карыснай працы. Бо ўсе, хто выйшаў і навёў прыгажосць вакол сваіх дамоў, паказалі прыклад іншым. Вельмі важна, каб большасць жыхароў хоць бы крышачку ўдзельнічалі ў агульнай справе, тады і вёска стане прыгажэйшай», — падсумаваў Сяргей Юцык.

Новы выгляд помніка ў Засімах.

Добраўпарадкаванне ў Стрыях.

А яшчэ згадаў, як упершыню вясной сюды прыехала новая старшыня сельвыканкама, арганізавала сход: «Таццяна Мікалаеўна расказала, якія работы будуць выкананы за кошт бюджэту, папрасіла кожнага зрабіць свой пасільны ўнёсак. Усе разам накрэслілі план дзеянняў, і вось ужо бачны першы вынік. Днямі забраць спілаваныя аграмадныя дрэвы, адвезці драўніну для патрэб кацельнай абяцалі спецыялісты сельгаспрадпрыемства. Ну а нам застанецца «касметыка» — прыбраць лішнія галіны, вясной высадзіць кветкі. Пазней планую зрабіць навес з лаўкамі ў тым месцы, куды прыязджае аўтакрама, каб вяскоўцам было камфортна праводзіць час у чаканні машыны. Ужо размаўляў з людзьмі, якія абяцалі дапамагчы матэрыяламі і тэхнікай. Думаю, што да вясны ўсё зробім».

Старшыня сельскага Савета Таццяна БІЧ і староста вёскі Стрыі Сяргей ЮЦЫК.

— А налета ў вёсцы запланавана замена электрычных сетак. Такім чынам з'явіцца магчымасць для ахвотных устанавіць электраацяпленне ў дамах, — гаворыць Таццяна Біч. І далей згадвае, як прыехала сюды вясной і была здзіўлена выглядам скрыжавання ў цэнтры вёскі: зараслі, нібы ў лесе, не было бачна, куды паварочваць. Сяргей Аляксандравіч разам з памочнікамі прарэдзілі ўчастак, у выніку адкрыўся агляд, ну і нагул пасвятлела ў цэнтры вёскі.

Так што Стрыі неўзабаве павінны выйсці з разраду неперспектыўных. Тым больш што знаходзіцца вёска ў маляўнічай мясціне і сама цяпер выглядае даволі прывабна. Староста вёскі стварае прытулак для бяздомных жывёл. Значыць, сюды паедуць валанцёры, аматары хатніх гадаванцаў. Лічу, што са старастам вёсцы пашанцавала, — заключыла старшыня.

Патрыёты малой радзімы

У вёсцы Басяч, дзе пражывае без малога 90 чалавек, шмат для паляпшэння знешняга выгляду зрабілі два чалавекі — староста вёскі Уладзімір Прасянюк і яе жыхар Павел Шамшын. З дапамогай бензапіл мужчыны прарэдзілі зараснікі ўздоўж дарог, прыбралі лішнюю расліннасць, навялі парадак.

Фермер Уладзімір Серада жыве ў вёсцы Казішча. Уладзімір Аляксеевіч — вялікі патрыёт сваёй малой радзімы. Пра гэта гавораць яго шматлікія ўчынкі. Напрыклад, па ўласнай ініцыятыве ён абкошвае вуліцы, узбочыны, могілкі, падтрымлівае ў парадку ладны ўчастак тэрыторыі. Акрамя таго, ён выкупіў пустыя будынкі ФАПа, магазіна, рамантуе іх, прыводзіць у парадак, каб надаць ім новае жыццё, магчыма, стварыць там новыя рабочыя месцы. Фермер нават заклаў два міні-паркі ў сваёй роднай вёсцы, неаднойчы высаджваў дрэвы і кустоўе на месцы знесеных старых дамоў, даваў саджанцы нават для іншых населеных пунктаў. Ужо не адзін год Уладзімір Серада займаецца дабрачыннасцю, напрыклад, нядаўна выступаў спонсарам пры правядзенні мерапрыемстваў на Дзень пажылых людзей.

Памятныя мясціны

Усяго на тэрыторыі сельсавета 16 помнікаў, з іх 13 увекавечваюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Усе помнікі даглядае мясцовая ўлада разам са шматлікімі памочнікамі, у ліку якіх школьныя, працоўныя калектывы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Паступова асобныя з помнікаў перажываюць рэканструкцыю і абнаўленне. Сёлета, паводле слоў старшыні сельсавета, праведзена рэканструкцыя помніка на брацкай магіле ў вёсцы Засімы, дзе пахаваны 43 воіны-вызваліцелі і 26 партызан атрада імя Чапаева. Апошні раз карэнным чынам гэты помнік аднаўлялі ў 1986 годзе. Сёлета паставілі новую агароджу, замянілі пляцоўку каля абеліска і мемарыяльныя дошкі, пасадзілі новыя дэкаратыўныя расліны.

* * *

Старшыня Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр МАЙСЯЮК:

— Буховіцкі сельсавет сёння ўяўляе сабой адзін з прыкладаў эфектыўнай работы па добраўпарадкаванні. Яго старшыня Таццяна Біч арганізавала старастаў вёсак, праводзіць даволі рэзультатыўную работу з насельніцтвам. Вяскоўцы многае робяць талакой. Некаторыя грамадзяне праяўляюць ініцыятыву, прыводзяць у жыццё няхай і невялікія, але важныя праекты. І цяпер можна гаварыць пра пэўныя вынікі.

Парадак, знешні выгляд населенага пункта ўяўляецца надзвычай важным яшчэ і ў кантэксце развіцця сельгасвытворчасці. Калі гаварыць пра Буховічы, то мясцовая гаспадарка, ААТ «Пакроўскае», паспяхова функцыянуе, мае добрыя перспектывы. Зараз тут падыходзіць да завяршэння будаўніцтва сучаснага жывёлагадоўчага комплексу, які ўключае ў сябе шэраг пабудоў. Гэта будзе суперсучасная вытворчасць малочнай прадукцыі, якая патрабуе высокакваліфікаваных, адказных працаўнікоў. Вядома ж, людзі хочуць жыць і працаваць там, дзе прыгожа, дзе дбаюць пра добраўпарадкаванне, пра знешні выгляд населеных пунктаў.

Работы па паляпшэнні нашых аграгарадкоў, вёсак вядуцца ў кожным сельсавеце. Сёння асаблівая ўвага ўдзяляецца рамонту, асфальтаванню дарог. Напрыклад, нядаўна абнавілі асфальт у Хабовічах і Андронаве. У Андронаве, дакладней, у суседнім пасёлку Птушкафабрыка, сёлета з'явіўся новы будынак модульнага ФАПа.

Модульны ФАП у пасёлку Птушкафабрыка.

Гэта першая спроба рэалізацыі падобнага праекта на Брэстчыне. Перавага такога будаўніцтва ў хуткасці і эканамічнасці. На загадзя падрыхтаваны падмурак ставяцца два модулі, якія нечым нагадваюць вагончыкі. Затым падводзяцца вада, каналізацыя, электрычнасць, праводзяцца ўнутранае аздабленне, добраўпарадкаванне. ФАП размешчаны ў зручным для людзей месцы — каля магазіна. Установа аховы здароўя паспяхова працуе, кожны дзень там вядзе прыём фельчар. У новым будынку камфортна і супрацоўнікам, і пацыентам.

Сёлета многа зроблена па праграме падрыхтоўкі да раённых «Дажынак» у Батчынскім сельсавеце. У Батчы ўпор зрабілі на рамонт, абнаўленне аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Адрамантавалі фасад школы і будынка школьнай сталовай, да лепшага памянялі знешні выгляд гандлёвыя аб'екты, шматкватэрныя дамы. Асфальт з'явіўся на вуліцах Палявой і Спартыўнай, а на Садовай стары асфальт заменены на новы. Адрамантаваны адміністрацыйны будынак і агароджа.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
фота аўтара.

Кобрынскі раён.

Пад патранажам парламентарыяў

У Магілёве на міжнародным фестывалі творчасці інвалідаў «Разам мы зможам больш» закранулі і сацыяльныя пытанні

Колькі было эмоцый, абдымкаў, цёплых сустрэч за гэтыя як адно імгненне прамільгнуўшыя пяць дзён фестывалю, не пералічыць! У Магілёў прыехалі 300 гасцей з усіх куткоў Беларусі і Расіі. Шмат хто з іх ведае адзін аднаго, чакаў гэтай сустрэчы, рыхтаваўся. Канцэрты, выставы, конкурсныя праслухоўванні, майстар-класы, іншыя мерапрыемствы. І не толькі культурныя. Гэты фестываль запомніцца тым, што на ім падымаліся праблемныя пытанні інвалідаў на міжнародным узроўні. І разглядаліся яны з удзелам парламентарыяў Саюзнай дзяржавы.

Важныя сустрэчы

У дзень адкрыцця ў фае Магілёўскага абласнога цэнтра метадычнай і культурна-асветнай работы яблыку не было дзе ўпасці. Заўзята гучалі народныя інструменты, спявалі і танцавалі артысты ў народных строях, удзельнікі дзяліліся сваімі дасягненнямі і напрацоўкамі. Канстанцін Цой па нацыянальнасці ўзбек, але даўно жыве ў Смаленскай вобласці і лічыць яе сваёй радзімай.

— У Магілёў прыехаў упершыню, але мне ўжо падабаецца, — кажа ён.

Падобныя сустрэчы даюць надзею людзям з абмежаванымі магчымасцямі, разнявольваюць іх, дазваляюць адчуць сябе патрэбнымі грамадству.

— Гэта вялікі абмен вопытам. Мне як музыканту цікава ведаць, як спяваюць іншыя. Цікава пазнаёміцца з новымі людзьмі.

Пра тое ж казаў і Анатоль Прысяжнюк, міма яго работ з дрэва немагчыма было прайсці. Карункавыя, з мноствам дробных дэталяў, яны здаваліся амаль паветранымі.

— Мой дом у Верашковічах Смаленскай вобласці ўсе ведаюць па гэтых узорах, — усміхаецца драўляных спраў майстар. — Я сам іх прыдумваю. Езджу шмат, усю Смаленскую вобласць аб'ехаў. Раней, калі рукі, ногі былі здаровыя, нічога не перашкаджала працаваць. Нават тады, калі пальцы страціў. Трэба было зноў вучыцца трымаць лобзік, але ж прывык. Сіла волі была такая, што пераадолеў усе цяжкасці.

Аляксандр Шабашкін, дырэктар школы мастацтваў горада Старыца Цвярской вобласці, прыехаў на фестываль як баяніст. Па сумяшчальніцтве ён яшчэ і кіраўнік ансамбля рускіх народных інструментаў, а таксама дэпутат. Праблемы са зрокам не перашкаджаюць яму жыць на поўную моц. І шмат у чым яму дапамагае ўдзел у такіх вось конкурсах.

— Гэты фестываль вельмі важны, ён дае магчымасць людзям з інваліднасцю рэалізаваць свае навыкі, уменні, здольнасці, — кажа ён. — Такіх фестываляў павінна быць больш. Упершыню трапіў на яго ў 2017 годзе. Уразіў высокі ўзровень арганізацыі, артыстаў. Як у Расіі, так і ў Беларусі шмат таленавітых людзей з інваліднасцю. Хочацца, каб усім ім пашчасціла.

Старшыня Цвярской абласной арганізацыі Усерасійскага таварыства інвалідаў Алена ДРАГІНА прапануе звярнуць увагу на выставачныя работы яе падапечных. Вось гэтыя вышытыя падушачкі — справа рук Валянціны Смалёнавай: яркія карціны, упрыгожаныя шоўкавымі стужкамі, —

Карункавая прыгажосць Анатоля ПРЫСЯЖНЮКА.

Ірыны Гусаравай, а далікатныя сувеніры з бісеру — творчасць маладой аўтаркі Алены Токаравай са Ржэва. Таленавітая дзяўчына, на жаль, не размаўляе, але калегі разумеюць яе па жэстах.

Роўныя магчымасці — роўныя правы

Пад такім дэвізам прайшоў круглы стол, які сабраў прадстаўнікоў міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, аховы здароўя, дэпутатаў Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, мясцовай улады, грамадскіх арганізацый. На фестывалі ўпершыню закранулі балючую тэму праблем, з якімі сутыкаюцца ў жыцці людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

— Фестываль, які праходзіць на магілёўскай зямлі, унікальны. Ён — вынік сумеснай дзейнасці грамадства і парламентарыяў, — адзначыла ў размове з журналістамі **старшыня Камісіі Парламенцкага Сходу па працы, сацыяльнай палітыцы і ахове здароўя, сенатар Расійскай Федэрацыі Алена АФАНАСЬЕВА.** — Гэта элемент салідарнасці, павагі адзін да аднаго. Калі бачыш, як людзі сустракаюцца, з якой цеплынёй адзін да аднаго ставяцца, ёсць жаданне працаваць. Радасна, калі з'яўляюцца такія творчыя аб'яднальныя, сяброўскія праекты. У гэтым вялікая заслуга дэпутатаў. Наша справа — абараняць інтарэсы звычайнага чалавека.

Парламентарый звярнула ўвагу на важнасць таго, што мерапрыемства не абмяжоўваецца культурнымі рамкамі, на ім абмяркоўваюцца і такія сур'ёзныя пытанні, як дабрабыт чалавека з інваліднасцю, яго сацыялізацыя, умовы пражывання на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы, дапамога на ўзроўні заканадаўства.

— Мне падаецца, што наша Саюзная дзяржава — гэта такі элемент дзяржаўнай палітыкі, які павінен служыць прыкладам для іншых дзяржаў, — падкрэсліла Алена Афанасьева. — Для нас важна ўніфікаваць наша заканадаўства так, каб эканоміка працавала на дабрабыт нашых людзей. Ствараючы роўныя магчымасці, мы забяспечваем і роўныя правы на тэрыторыі дзвюх краін. Адно рухае другое.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу па працы, сацыяльнай палітыцы і ахове здароўя, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валерый МАЛАШКА паведаміў, што праблемныя пытанні людзей з асаблівасцямі — у цэнтры ўвагі парламентарыяў.

— Фестываль трансфармаваўся з пляцоўкі, якая адлюстроўвае творчыя магчымасці і здольнасці людзей з пэўнымі абмежаванні, у палітычную, дзе ідзе абмеркаванне тых навел і навацый, якія кожная дзяржава паасобку павінна даць грамадзянам, — рэзюмаваў ён. — Круглы стол можа стаць дадатковым інструментам, які дазволіць нам глыбей разабрацца ў праблемах, каб іх максімальна хутка нівеліраваць праз заканадаўчыя акты і абмеркаванні на высокім узроўні. Сёлета мы ўпершыню адышлі ад размоў пра творчыя дасягненні да абмеркаванняў набалелых пытанняў з прадстаўнікамі таварыстваў па зроку, апорна-рухальнага апарату і гэтак далей. Ёсць нюансы, якія мы павінны ўлічваць у нашым агульным жыцці.

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Марына АРЦЁМЕНКА расказала, што ў Беларусі рэалізуецца пілотны праект па рэгістрацыі тэхнічных сродкаў рэабілітацыі па паскоранай праграме.

Брэсцкія сувеніры.

— Гэта зроблена ў рамках рашэнняў, якія былі прынятыя на вышэйшым узроўні, — адзначыла яна. — Мы ўжо на этапе атрымання дазволу, каб можна было пастаўляць сродкі рэабілітацыі на рынкі Казахстана, Расійскай Федэрацыі. У цэлым за апошнія пяць гадоў дасягнуты значны прагрэс па павышэнні якасці жыцця людзей з інваліднасцю. Амаль два гады таму ў Беларусі быў прыняты Закон «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». У нас развіваецца рэабілітацыйная індустрыя і створана даступнае асяроддзе для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, павышаецца інфармаванасць грамадства па праблемных пытаннях людзей з інваліднасцю.

Намеснік міністра звярнула ўвагу на тое, што ў Беларусі дзейнічае рэспубліканскі міжведамасны савет па правах інвалідаў, які ўзначальвае намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка. У краіне створана 148 саветаў абласнога і раённага ўзроўняў па правах інвалідаў. У гэтыя структуры ўваходзяць лідары рэгіянальных грамадскіх аддзяленняў, якія даносяць праблемныя пытанні да органаў улады.

Фестываль мацнее

Гэты фестываль увойдзе ў гісторыю яшчэ і тым, што змяніў статус. Дагэтуль ён праводзіўся раз у два гады. Рашэнне зрабіць яго штогадовым прынятае Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы і Парламентам Саюзнай дзяржавы. Як было адзначана парламентарыямі, гэта мерапрыемства адзінае такога тыпу ў Саюзнай дзяржаве.

— Праводзіць фестываль — вельмі ганаровая місія для нас, — рэзюмаваў **дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Алег ХМЯЛЬКОЎ.** — Ды і самім удзельнікам ён падабаецца. Мы прыкладаем усе намаганні, каб мерапрыемства існавала. Прасякаешся павагай да людзей, якія маюць абмежаванасці па здароўі і дасягаюць сваіх мэт праз пераадоленні. Мы хацелі б ведаць, што неабходна ім не толькі для таго, каб развівацца ў творчасці, а і наогул для сацыялізацыі. У гэтым задзейнічаны адпаведныя міністэрствы і парламентарыі.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

У тэму

Старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях сацыяльнай сферы, сацыяльнай абароны грамадзян і па справах моладзі Магілёўскага аблсавета, галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Ігар КАСКО:

— Людзі з абмежаванымі магчымасцямі, безумоўна, маюць патрэбу ў падтрымцы. І фестываль якраз адно з такіх мерапрыемстваў, якое дае ім магчымасць адаптавацца ў грамадстве, даведацца пра сваю значнасць, паказаць, што яны могуць нешта рабіць нават лепш, чым цалкам здаровыя людзі. Кожны чалавек з абмежаванымі здольнасцямі мае таленты, якія трэба дапамагчы яму раскрыць. Такія людзі не павінны сядзець за закрытымі дзвярамі ў чатырох сценах, ім патрэбна сацыялізацыя. Звярніце ўвагу, як мяняецца наш Магілёў, паўсюль падчас рэканструкцыі ідзе стварэнне безбар'ернага асяроддзя. А ў новым жылым фондзе першапачаткова прадугледжваецца яго стварэнне.

З пачатку 2000-х у Беларусі на ўсю моц развіваюцца рэабілітацыйныя мерапрыемствы. З'явіліся цэнтр ранняга ўмяшання, рэабілітацыйныя аддзяленні і цэнтры для дзяцей малодшага і старэйшага ўзростаў, развіваем катамнестычную службу, сутнасць якой — адсачыць з моманту нараджэння дзіцяці праблемы са здароўем і своечасова іх папярэдзіць. Да Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы прыбудоўваем рэабілітацыйны корпус. Былая наша «рэабілітацыя» не адпавядае патрабаванням, таму прынята рашэнне ўвесці новую, сучасную. Тут мы зможам і дзяцей лячыць, і ў раннія тэрміны пачынаць рэабілітацыю. На базе гэтага цэнтра прадугледзім розныя дапаможныя службы, якія дапамагаюць сацыялізацыі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.785. Нумар падпісаны ў 19.30 19 лістапада 2024 года.

«НЕ ПРАПАЛЬВАЙ СВАЁ ЖЫЦЦЁ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У перыяд вялікіх выхадных: з 7 па 11 лістапада 2024 года ў Мінскай вобласці было абследавана больш за 5400 домаўладанняў (кватэр), задзейнічана 556 работнікаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях. Усяго з пачатку года на Міншчыне адбылося 1267 пажараў, загінуў 121 чалавек», — адзначыла **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Алена НЕМАГАЙ.**

Прафілактыка на Барысаўшчыне

Паводле даных на 18 лістапада ў раёне з пачатку года адбылося каля 145 пажараў, якія забралі жыцці 13 чалавек. Таму на тэрыторыі прайшла маштабная прафілактычная акцыя, у якой узялі ўдзел прадстаўнікі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, Навукова-даследчага інстытута пажарнай бяспекі і іншых служб. «Толькі сумеснымі намаганнямі можна выратаваць жыцці грамадзян», — упэўненыя ў МНС. Пасля праведзенага інструктажу ўдзельнікі акцыі былі падзеленыя на групы і накіраваны па вызначаных маршрутах. Асноўнай задачай стала выяўленне небяспечных умоў пражывання грамадзян і інфармаванне іх аб правілах пажарнай бяспекі.

У адным з домаўладанняў удзельнікі рэспубліканскай кампаніі высветлілі, што ў доме адсутнічае аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Ратавальнікі патлумачылі гаспадару важнасць установкі такой прылады, распавялі пра прынцып яе работы і пра тое, як правільна сачыць за станам, каб своечасова адрэагаваць на небяспеку.

У кожным домаўладанні, дзе пабываў удзельнік акцыі, была пакінута наглядна-выяўленчая прадукцыя з важнымі напамінамі пра бяспеку. Ратавальнікі таксама нагадалі нумары тэлефонаў, па якіх трэба тэлефанаваць у надзвычайнай сітуацыі: «101» або «112». Таксама грамадзянам, якія маюць згубную звычку курэння, настойліва рэкамендавалі рабіць гэта на вуліцы, а лепш задумацца пра тое, каб зусім адмовіцца ад яе.

Бяспека ў дамах Смалявіччыны

У Смалявіцкім раёне прафілактычныя маршруты ахапілі населеныя пункты Забалоцкага, Пекалінскага і Азярыцка-Слабадскога сельсаветаў.

Статыстыка паказвае, што чалавечы фактар застаецца асноўнай прычынай узнікнення пажараў. Гэта падкрэслівае важнасць работы з насельніцтвам. У ходзе абследавання домаўладанняў адзінокіх і шматдзетных сем'яў асаблівая ўвага надаецца стану пячнога ацяплення: правяраюцца яго гатоўнасць і спраўнасць у ацяпляльны сезон, наяўнасць перадтопачнага ліста памерам не менш за 50 на 70 сантыметраў, а таксама адсутнасць расколін у печах і дымаходах.

— Пячное ацяпленне з'яўляецца распаўсюджаным спосабам абагравання, але няправільнае яго выкарыстанне можа прывесці да трагічных наступстваў, — адзначыў **намеснік начальніка Смалявіцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях падпалкоўнік унутранай службы Сяргей ТАРАСЕВІЧ.** — Мы тлумачым грамадзянам, як правільна эксплуатаваць печы і каміны, каб пазбегнуць небяспечных сітуацый. Таксама акцэнтуем увагу на важнасці ўстаноўкі аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. Гэты невялікі, але жыццёва важны прыбор можа выратаваць жыццё».

Падчас візітаў ратавальнікаў жыхары розных узростаў даведваюцца пра нядаўнія пажары ў раёне, вобласці і краіне, а таксама пра рызыкі, звязаныя з курэннем у доме, небяспеку пакідання дзяцей без нагляду і недастатковага кантролю за падлеткамі.

Праграма «Сацыяльная абарона»

З набліжэннем выхадных кожны з нас імкнецца атрымаць асалоду ад адпачынку, правесці час з блізкімі і забыцца пра будзённую мітусню. У гэтыя дні асабліва важна памятаць пра бяспеку і абараніць свае дамы ад магчымых надзвычайных сітуацый. Пра гэта днямі казалі работнікі Цэнтральнага апарату МНС, падпарадкаваных яму падраздзяленняў, прадстаўнікі зацікаўленых суб'ектаў прафілактыкі, Мінскага РУУС, упраўлення па працы і занятасці сацабароны райвыканкама, упраўлення па адукацыі, унітарнага прадпрыемства «Мінгаз», а таксама прадстаўнікі Энергагазнагляду і Папярнянскага сельсавета грамадзянам, чые дамы яны наведалі.

Як адзначыў **галоўны спецыяліст упраўлення нагляду і прафілактыкі МНС Міхаіл БАТУРА,** напярэдадні і падчас ацяпляльнага сезона, МНС нацэлена на правядзенне прафілактычнай работы і выяўленне праблем у адзінокіх пажылых грамадзян, інвалідаў 1-й і 2-й групы, грамадзян, схільных да злоўжывання алкагольнымі напоямі, а таксама на наведванне дамоў, дзе пражываюць шматдзетныя сем'і і сем'і, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Першы адрас абраны невыпадкова. Суб'екты прафілактыкі тут частыя госці. Сям'я М. адносіцца да катэгорыі злоўжываючых алкаголем, яны жывуць у небяспечных умовах, таму знаходзяцца на кантролі. Парушэнні відавочныя: разеткі эксплуатуюцца без карпусоў, правадныя скруткі, газавыя балоны ў адкрытым доступе — усё ўяўляе небяспеку для жыцця. Па гэтых фактах правялі прафілактычную гутарку, уручылі рэкамендацыі і ўстанавілі ў доме аўтаномны пажарны апавяшчальнік, які будзе «ахоўнікам» для гэтай сям'і.

Наступны адрас па вуліцы Сонечнай. Да сям'і Б. ратавальнікі таксама прыйшлі з праверкай. Каля 12 гадоў таму ў гэтым доме здарыўся пажар, у выніку якога была пашкоджана праводка. Як і чаму гаспадары дагэтуль не знайшлі магчымасці ліквідаваць наступствы — пытанне важнае, але не першараднае для работнікаў МНС. У госці да бабулі на выхадныя прыехала дачка з двума непаўналетнімі дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. З парога дома бачныя прыкметы небяспечных умоў пражывання, і для гэтага неабавязкова быць спецыялістам.

Рашэнне камісіі — праінфармаваць установу адукацыі для далейшага кантролю за гэтай сям'ёй і тату з просьбай, каб забраў дзяцей на месца пастаяннага жыхарства, дзе, па словах прадстаўнікоў адукацыі, створаны ўмовы, якія не ўяўляюць пагрозы для жыцця. Гісторыя сумная, але павучальная.

Ганна Вікенцьева была рада гасцям, бо яны праверылі печ і комін, устанавілі пажарны апавяшчальнік. А галоўнае, у рамках дзяржаўнай праграмы «Сацыяльная абарона» — аказанне дапамогі адзінокім пажылым грамадзянам і інвалідам — запісалі яе на чаргу па ўстаноўцы новага пячнога ацяплення. Ганне Вікенцьевай 83 гады і яна клапоціцца пра сваю бяспеку. Жанчына была вельмі ўдзячная камісіі і адзначыла, што адчула падтрымку і ўвагу, якія так важны для яе.

Прычына кожнага чацвёртага пажару

Як адзначаюць ратавальнікі МНС, не затушаныя цыгарэты могуць стаць прычынай сур'ёзных пажараў як у жылых памяшканнях, так і на вуліцы. Яны заклікаюць курцоў захоўваць асцярожнасць і не пакідаць недакуркі без нагляду. «Пажары, якія адбыліся з-за курэння, заўсёды адрозніваюцца сваім доўгім перыядам развіцця, значным дымавыдзяленнем і, на жаль, вельмі часта суправаджаюцца гібеллю людзей. Усяго адзін недакурак, які ўпаў на ложак, можа тлець ад 20 хвілін да трох гадзін, а потым стаць крыніцай загарання. Дастаткова 3-4 удыхаў у дыме, і гаспадара ўжо не выратаваць. А калі напярэдадні гора-курэц ужываў алкагольныя напоі — шанц яго выратаваць яшчэ меншы», — распавёў **намеснік начальніка Салігорскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксей БАНЬ.**

Прафілактычныя мерапрыемствы з насельніцтвам вельмі важныя. Яны служаць напамінам, што пажар можна прадухіліць, загадзя паклапаціўшыся аб выкананні простых патрабаванняў. **Інспектар сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Салігорскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Соф'я КУДЗЕЛКА** на рэальных прыкладах паказала навучэнцам дзяржаўнага каледжа горада, да чаго можа прывесці шкодная і вельмі небяспечная звычка — курэнне.

«Вам прасцей прыняць дрэнныя звычкі грамадства? А што, калі вы занесяце ў свой лад жыцця станоўчыя звычкі, напрыклад спорт, чытанне кніг, знойдзеце такі занятак, дзякуючы якому вы будзеце развівацца?» — заклікала супрацоўнік МНС.

Пасля гутаркі з падлеткамі, многія з якіх пражываюць у інтэрнаце, прадэманстравалі відэаролік «Пажарная бяспека ў інтэрнаце». З маладымі людзьмі таксама правялі гульню «Назаві прычыну», «Разгадай рэбус», «Збяры пазл», дзе яны змаглі праявіць свае веды, уважлівасць, логіку і памяць. «А вы ведалі, што курэнне — гэта прычына кожнага чацвёртага пажару? Што больш за 80 працэнтаў загінулых на пажары курылі ў ложку? Цяпер будзеце ведаць!» — падагульніла Соф'я Кудзелка.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота МНС.

У тэму

Маштабная акцыя ад МНС праходзіць на Міншчыне

З надыходам халадоў і няўстойлівага надвор'я нялішнім будзе нагадаць грамадзянам аб захаванні правіл пажарнай бяспекі, бо ў перыяд ацяпляльнага сезона, на жаль, павялічваецца рызыка ўзнікнення пажараў з-за бестурботнасці і халатнасці грамадзян. Агонь патрабуе да сябе асаблівай увагі, нядбайнасць у абыходжанні з ім можа абярнуцца бядой. З мэтай папярэджання пажараў супрацоўнікі МНС праводзяць пажарна-прафілактычную работу з грамадзянамі, якія патрапляюць пад рызыку ўзнікнення надзвычайных сітуацый.

У перыяд правядзення рэспубліканскай акцыі «Не прапальвай сваё жыццё» абследуюцца домаўладанні грамадзян, дзе пражываюць асобы, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі, вядуць асацыяльны лад жыцця, а таксама іншыя грамадзяне.

Вядома ж, работнікі МНС робяць акцэнт на прафілактычную і інфармацыйна-тлумачальную работу. Кожны імкнецца дастукацца да грамадзян, накіраваць на шлях выпраўлення. Ратавальнікі звяртаюць пільную ўвагу на наяўнасць і спраўнасць аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, бо дадзены прыбор ужо даўно даказаў сваю эфектыўнасць у папярэджанні гібелі людзей на пажарах. Правяраецца таксама стан пячнога ацяплення і электраабсталявання. Праводзяцца прафілактычныя гутаркі з прывядзеннем апошніх прыкладаў пажараў з гібеллю, высвятляюцца праблемы ў грамадзян, растлумачваюцца дзеянні ў той ці іншай надзвычайнай сітуацыі.

— Не варта забывацца і на, што заўчаснае закрыццё засланкі печы можа прывесці да атручвання ўгарным газам, які не мае ні колеру, ні паху і ўтвараецца пры любых відах гарэння. Менавіта таму неабходна заканчваць паліць у печы не менш чым за дзве-тры гадзіны да адыходу да сну. Пры гэтым спачатку пераканайцеся, што вуголле цалкам прагарэла, — кажа начальнік сектара нагляду і прафілактыкі Лагойскага РАНС Уладзіслаў Рамановіч.

Рэспубліканская прапагандысцкая кампанія «Не прапальвай сваё жыццё!», якая накіравана на папярэджанне пажараў і гібелі людзей ад іх па прычыне неасцярожнага абыходжання з агнём, праводзіцца ва ўсіх кутках Міншчыны. Не абмінула яна і Слуцк. У рамках акцыі работнікі сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Слуцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях сумесна з кадэтамі Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча адправіліся на аўта- і чыгуначны вакзал, каб расказаць людзям аб неабходнасці захавання правілаў пажарнай бяспекі, аб недапушчэнні курэння дома, лежачы ў ложку і тым больш — у стане алкагольнага ап'янення.

Гараджане, у сваю чаргу, пры жаданні забівалі цвікі ў імправізаваную цыгарэту і атрымлівалі за гэта прыемны бонус у выглядзе настольнага календара. Таксама тыя, хто курыць, маглі абмяняць цыгарэту на цукерку, папрактыкавацца і паспаборнічаць у надзіманні паветраных шароў для «праверкі» аб'ёму лёгкіх. Вельмі спадабалася наведвальнікам вакзала гульня «Бяспечная бутэлечка», а таксама праходзіць тэсты ў дадатку «МНС Беларусі: дапамога побач».

У ходзе мерапрыемстваў у наведвальнікаў таксама паўсталі пытанні аб іх дзеяннях у выпадку ўзнікнення пажару і парадку выкарыстання першасных сродкаў пажаратушэння, на якія яны атрымалі разгорнутыя адказы. Усім удзельнікам акцыі ўручаліся тэматычныя прафілактычныя буклеты і налепкі, брашуры і салодкія прызы.

Нагадваем чытачам, што акцыя працягваецца, і наперадзе вас чакае шмат мерапрыемстваў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64) по поручению ликвидатора **ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»** (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б, тел. +375 (29) 351 10 33) проводит открытый электронный аукцион по продаже

ЭКСКАВАТОРА ОДНОКОВШОВОГО ЭО-3223 «АМКОДОР», 2008 г. в.,

заводской № Y39ЭО32230408242, инв. № по бух. учету 113439.

Расположен по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

Начальная цена с НДС (20 %) – 21 420,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – 2 142,00 бел. руб. Стоимость снижена на 30 %.

Электронные торги состоятся 05.12.2024 в 10.00.

Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее 03.12.2024 включительно до 17.00*.

*Подача заявления на участие в электронных торгах включает в себя аккредитацию (верификацию) на электронной торговой площадке «TORGI.RLT.BY» (далее – ЭТП). Оператор ЭТП **в течение 2 рабочих дней со дня заполнения заявления-анкеты на аккредитацию (верификацию)** с приложением документов, предусмотренных в подпункте 2.1.5 пункта 2.1 Регламента электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY» принимает решение об аккредитации (верификации) либо отказе в аккредитации (верификации) и направляет соответствующее уведомление с использованием функциональных возможностей ЭТП и (или) электронной почты и (или) мобильного телефона, указанных при аккредитации (верификации).

Извещение о проведении предыдущих торгов опубликовано в газете «Звязда» от 11.06.2024, 18.09.2024.

Организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», адрес электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321.

Контактные телефоны: +375 (17) 516-80-64, +375 (44) 789-10-18.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by, и Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Задатки для участия в электронных торгах перечисляются не позднее дня окончания приема заявлений на участие на расчетный счет № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен договором купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учёт приобретаемого имущества за свой счет.

УНП 600077220

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 03.12.2024.

Лот № 1: Торговый комплекс

с инв. № 200/D-168451, 1599,8 кв. м.

Адрес: Витебская область, г. Витебск, ул. Богатырева, 8А-3.

Торговый комплекс с инв. № 200/D-168451 находится в капитальном строении с инв. № 200/С-81193, расположенном на земельном участке с кадастровым номером 240100000001009153 площадью 0,2152 га.
Право аренды. Доля: 9/10.

Обременения: ипотека, аренда, сервитут.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 1 315 357,00 долларов США.
Задаток – 448 142,13 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **28.11.2024 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «Криница»** (Продавец).

Аукцион состоится 11.12.2024 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1, состав:

1. Контрольный пост и проходная, инв. № 621/С-1161, 66,5 кв. м.
2. Здание подсобного блока, инв. № 621/С-1163, 1138,5 кв. м.
3. Помещение мойки пивовозов, инв. № 621/С-1164, 113,6 кв. м.
4. Насосная станция над артскважиной, инв. № 621/С-1166, 50,1 кв. м.
5. Здание насосно-фильтровальной станции, инв. № 621/С-1168, 254,6 кв. м.
6. Сушильный цех, инв. № 621/С-1170, 264,2 кв. м.
7. Административное здание, инв. № 621/С-1171, 322,3 кв. м.
8. Здание главного корпуса, инв. № 621/С-1172, 4055,3 кв. м.
9. Сооружение площадка для стеклобоя, инв. № 621/С-3617, 111,6 кв. м.
10. Здание котельной, инв. № 621/С-17178, 517 кв. м.
11. Внеплощадочные и площадочные сети водопровода, инв. № 621/С-20589, 2994 м.
12. Кабельная ЛЭП, инв. № 621/С-20588, 1196,7 м.
13. Внеплощадочные и площадочные сети канализации, инв. № 621/С-20587, 2462,2 м.
14. Низковольтные сети промплощадки, инв. № 621/С-20586, 3028 м.
15. Площадочные тепловые сети, инв. № 621/С-20584, 393 м.
16. Сети газопровода, инв. № 621/С-20581, 248 м.
17. Артскважина с насосом ЭВЦ 10х63-110, инв. № 621/С-1028912.
18. Благоустройство (проезды, площадки, ограждения), инв. № 621/С-1029402, площадь – 11366,0 кв. м.
19. Резервуар промывочной воды, инв. № 621/С-1029401, площадь – 27,0 кв. м.
20. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029400, площадь – 148,3 кв. м.
21. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029399, площадь – 151,5 кв. м.
22. Движимое имущество (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG»(gostorg.by)).
23. Объекты растительного мира (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

Адрес Лота № 1: Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Кутузова, 7; 7/5; 7/2; 7/1; 7/4; 7/9; 7/8; 7/7; 7/6. Артскважина: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, 11.

Начальная цена с НДС 20 % – 3 777 759,14 руб.

Задаток – 200 000,00 руб.

Земельные участки: 1. 624250100001000118, 5,2100 га; 2. 624250100001000119, 0,3600 га.
Право постоянного пользования.

Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков **06.12.2024 в 11.00**.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Минское областное потребительское общество извещает о проведении электронных торгов

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА № 114

с инвентарным номером 620/С-33565 общей площадью 498,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622283910601000644 площадью 0,0552 га (право аренды по 30.11.2122) по адресу: Минская область, Дзержинский район, Станьковский с/с, д. Станьково, ул. Марата Казея, 30В.

Начальная цена с НДС (20 %) – 77080,00 бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 7708,00 бел. руб.
Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества: № 83381, Недвижимость/Прочее.
Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 16.12.2024 9.00 до 16.12.2024 16.00.
Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Единая система электронных торгов по электронному адресу: https://torgi.gov.by.
Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу https://torgi.gov.by/lot/83381/19829/zdanie-magazina-114-s-inventarnym-nomerom-620-s-33565-raspolozhennoe-po-adresu-minskaya-oblast-dzerzhinskij-rajon-stan-kovskij-s-s-d-stan-kovo-ul-marata-kazeya-30v необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.12.2024 9.00.
Задаток должен быть зачислен на счет:

Республиканское унитарное предприятие «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь»	
Адрес	г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513
тел.	200-95-63, 200-73-33, 200-64-11
УНП	190318109
р/с	BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ»
БИК	BELBBY2X

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.
Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 28 дней со дня завершения электронных торгов.
Справочная информация: контактные телефоны продавца имущества: 8 (01716) 9-96-53, 8 (029)578-35-46.
Затраты на организацию и проведение электронных торгов составляют 5 % или менее в зависимости от конечной цены за лот согласно прейскуранту https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.pdf.
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с законодательством.

УНП 600037767

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 03.12.2024.

Лот № 1: Магазин «Универсам»

с инв. № 200/С-55222, площадь – 942,8 кв. м.

Адрес: Витебская область, г. Витебск, ул. Лазо, д. 129А.

Земельный участок № 240100000001002906, 0,3738 га.

Право постоянного пользования.

Обременения: ипотека, аренда.

Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.

Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 854 842,00 долларов США.

Задаток – 291 244, 47 руб.

Шаг электронных торгов – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **28.11.2024 в 16.00.**

Организатор электронных торгов:
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **УП «ПРОЕКТНЫЙ ИНСТИТУТ БЕЛГИПРОЗЕМ»** на праве хозяйственного ведения (Продавец).

Аукцион состоится **05.12.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: Volkswagen Caddy,

кузов (рама) № WV2ZZZ2KZBX223537.
Начальная цена с НДС 20 % – 20 064,00 руб.

Лот № 2: Volkswagen Caddy,

кузов (рама) № WV2ZZZ2KZAX147394.
Начальная цена с НДС 20 % – 9 600,00 руб.

Местонахождение Лотов № 1 – № 2: г. Минск, ул. Казинца, д. 86, корп. 3.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Минское областное потребительское общество извещает о проведении электронных торгов

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА № 28

с инвентарным номером 620/С-1637 общей площадью 103,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622255900001000337 площадью 0,0243 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Дзержинский район, г. Фаниполь, ул. Железнодорожная, 30.

Начальная цена с НДС (20 %) – 77021,50 бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 7702,15 бел. руб.
Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества: № 83372, Недвижимость/Прочее.
Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 16.12.2024 9.00 до 16.12.2024 16.00.
Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Единая система электронных торгов по электронному адресу: https://torgi.gov.by.
Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу https://torgi.gov.by/lot/83372/19827/zdanie-magazina-28-s-inventarnym-nomerom-620-s-1637-raspolozhennoe-po-adresu-minskaya-oblast-dzerzhinskij-rajon-g-fanipol-ul-zheleznodorozhnaya-30 необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.12.2024 9.00.
Задаток должен быть зачислен на счет:

Республиканское унитарное предприятие «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь»	
Адрес	г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513
тел.	200-95-63, 200-73-33, 200-64-11
УНП	190318109
р/с	BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ»
БИК	BELBBY2X

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.
Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 28 дней со дня завершения электронных торгов.
Справочная информация: контактные телефоны продавца имущества: 8 (01716) 9-96-53, 8 (029) 578-35-46.
Затраты на организацию и проведение электронных торгов составляют 5 % или менее в зависимости от конечной цены за лот согласно прейскуранту https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.pdf.
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с законодательством.

УНП 600037767

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Саюзная дзяржава

ЛЯЧЭННЕ АНКАЛАГІЧНЫХ ХВАРОБ, ПАЗВАНОЧНІКА І СУСТАВАЎ

Сумесныя праекты Беларусі і Расіі ў сферы аховы здароўя абмеркавалі ў Мінску

У РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава прайшло пасяджэнне сумеснай калегіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і Міністэрства аховы здароўя Расійскай Федэрацыі, прысвечанае ліцэнзаванню медыцынскай дзейнасці і медыцынскай акрэдытацыі арганізацый аховы здароўя Беларусі і Расіі.

Удзел у мерапрыемстве ўзялі **міністр аховы здароўя Беларусі Аляксандр ХАДЖАЕЎ, міністр аховы здароўя Расійскай Федэрацыі Міхаіл МУРАШКА, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валерый МАЛАШКА**, прадстаўнікі міністэрстваў, кіраўнікі арганізацый, падпарадкаваных міністэрствам аховы здароўя дзвюх краін.

Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў падкрэсліў, што два профільныя міністэрствы працуюць у адзіным рытме.

— На пасяджэнні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы дадзена даручэнне прааналізаваць, што ўдаецца зрабіць і што трэба ўдасканальваць у меддапамозе, якая аказваецца ўстановамі аховы здароўя Беларусі ў адносінах да грамадзян Расіі, так і наадварот. Асаблівае значэнне мае міжурадавае пагадненне Расійскай Федэрацыі і Беларусі ад 2006 года аб аказанні хуткай медыцынскай дапамогі на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы грамадзянам абедзвюх краін, у тым ліку беларусам без расійскага грамадзянства і наадварот, — адзначыў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы.

Дзмітрый Мезенцаў расказаў і аб іншых праектах Саюзнай дзяржавы:

— Два гады дапамагаем дзецям і дарослым з Саюзнай дзяржавы з анкалагічнымі хваробамі ў Цэнтры пратоннай тэрапіі ва Ульянаўскай вобласці. На наступны год для гэтых мэт вылучылі з бюджэту 202 мільёны рублёў. Прайшлі лячэнне па гэтай праграме ўжо больш за 200 чалавек. Прафесіяналы цэнтра ставяцца да ўсіх пацыентаў выдатна. Адмысловая атмасфера, якая пануе, таксама лечыць і дапамагае бацькам справіцца з хваробамі дзяцей. У наступным годзе з бюджэту выдзелена 72 мільёны рублёў для аказання дапамогі дарослым і дзецям, якія пражываюць на тэрыторыях, пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы. Завершана вялікая праграма Саюзнай дзяржавы «Спінальныя сістэмы» для дзяцей з сур'ёзнымі пашкоджаннямі пазваночніка. Урад адобрыў праект навукова-тэхнічнай праграмы Саюзнай дзяржавы «СаюзБіямембраны», работа па якой будзе пачата са студзеня. Таксама будзем аказваць дапамогу людзям з пашкоджаннямі плечавога сустава, верхніх канечнасцяў у атрыманні пратэзнага абсталявання, якое дазволіць ім сацыялізавацца ў поўным аб'ёме.

Аляксандр Хаджаеў адзначыў, што пытанні акрэдытацыі — неад'емная частка работы для дасягнення якаснай дапамогі насельніцтву. У Расіі досвед выкарыстання такога інструмента, як акрэдытацыя, больш працяглы, чым у Беларусі. Таму важна пераймаць пазітыўны досвед, каб не паўтараць памылак, і ўдасканальваць якасць дапамогі.

— Ліцэнзаванне таксама адыгрывае ключавую ролю і дае магчымасць узаемадзеяння паміж прыватнымі партнёрамі і дзяржавай. Таму, несумненна, пытанні, якія ў нас сёння на парадку дня, вельмі актуальныя, — дадаў Аляксандр Хаджаеў.

Міністр аховы здароўя Расіі Міхаіл Мурашка звярнуў увагу, што ў пытаннях забеспячэння здароўя грамадзян Беларусі і Расіі шмат пунктаў судакранання, але заўсёды ёсць куды развівацца.

— Адзін з сумесных вектараў — ліцэнзійныя патрабаванні, якія ўключаюць у тым ліку кваліфікацыю персаналу. Меддзейнасць спалучана з пэўнымі рызыкамі, яна патрабуе адзіных падыходаў да стандартызацыі. Размова ідзе аб будынках і збудаваннях, безбар'ерным асяроддзі і многім іншым. Наступны блок пытанняў — стандартызацыя падыходаў забяспечанасці абсталяваннем, медвырабамі. І патрабаванні тут агульныя, незалежна ад таго, дзяржаўная ці прыватная форма ўласнасці ва ўстановы аховы здароўя. Неабходна ўлічваць узровень гатоўнасці да аказання дапамогі, у тым ліку ў экстранных сітуацыях. Ён павінен быць максімальным з адпаведным рэанімацыйным, дыягнастычным і іншым абсталяваннем. І нарэшце, самы каштоўны рэсурс у сферы аховы здароўя — кадры. Іх падрыхтоўка, не толькі тэарэтычная, але і практычная, таксама вызначаецца пэўнымі стандартамі, — рэзюмаваў Міхаіл Мурашка.

Скажыце, доктар...

АДЧУВАЮ СКУРАЙ

Як абараніць дзіця ад атапічнага дэрматыту?

Гэта самая распаўсюджаная скурная хвароба, з якой сутыкаюцца дзіцячыя ўрачы. На яе пакутуе да 14 % дзетак у развітых краінах. У 65 % маленькіх пацыентаў сімптомы развіваюцца ва ўзросце да года, у 90 % — да пяці гадоў. Але амаль палова з іх да 14-15 гадоў сваю хваробу перарастаюць. Гэта хранічнае захворванне, таму сімптомы могуць знікаць і зноў з'яўляцца. Абвастрэнні можна прадухіліць, калі выключыць верагоднасць трапляння алергенаў у арганізм. Пра атапічны дэрматыт, яго праявы і прафілактыку расказала ўрач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Антаніна ШАЙКОВА.

— Антаніна Пятроўна, раскажыце, што такое атапічны дэрматыт.

— Гэта хранічнае генетычна абумоўленае запаленчае паражэнне скуры алергічнай прыроды. Яго пускавыя фактары — алергены, якія паступаюць у арганізм дзіцяці аліментарным (з прадуктамі), кантактным (пры судакрананні скуры з адзеннем і г. д.) або рэспіраторным шляхам (пры ўдыханні пылку, пылу).

— Звычайна ўрачы супакойваюць, што дзіця яго перарасце...

— Трэба сказаць, што атапічны дэрматыт у дзяцей звычайна развіваецца ў раннім узросце — часцей за ўсё ў 2-3 месяцы і праходзіць да 3-4 гадоў, але можа заставацца на ўсё жыццё.

— З-за чаго ён узнікае?

— Рызыка развіцця хваробы павышаецца пры спадчыннай схільнасці да алергічных рэакцый і калі будучая мама ўжывае ў ежу вялікую колькасць алергенаў (напрыклад, цытрусавых, клубніц і інш.), асабліва ў апошнім трыместры цяжарнасці.

Важна ўсведамляць, што атапічны дэрматыт — гэта не хвароба скуры, а праява ўнутраных непаладак у арганізме дзіцяці і несфарміраванасці яго стрававальнага тракта. Сітуацыя выглядае наступным чынам: некаторыя рэчывы, якія трапляюць у арганізм, не засвойваюцца і не могуць быць ператраўлены ў кішэчніку, нейтралізаваны печанню ці выведзены ныркамі і лёгкімі. Гэтыя рэчывы ў выніку пэўных ператварэнняў набываюць уласцівасці антыгенаў — чужародных для арганізма рэчываў — і выклікаюць выпрацоўку антыцелаў. Комплексы «антыген-антыцелы» правакуюць з'яўленне сыпу.

Іншы варыянт: цяжарная жанчына кантактавала (ела, мазалася, дыхала) з нейкімі «шкоднасцямі». Ужывала шакалад, напрыклад. Бялок какавы выклікаў з'яўленне антыцелаў у плода. Пасля, калі дзіця есць шакалад, антыцелы рэагуюць, і з'яўляецца сып.

Любы алергічны сып — гэта вынік. Прычына — кантакт арганізма з пэўнымі рэчывамі, якія менавіта для гэтага арганізма з'яўляюцца крыніцамі алергіі (алергенамі).

— Ці праўда, што атапічны дэрматыт найчасцей бывае ў дзяцей, якія ўжываюць не грудное малако, а малочную сумесь?

— З'яўленню першых прыкмет дзіцячага дэрматыту спрыяе ўжыванне ў ежу бялкоў каровінага малака (звычайна пры ўвядзенні сумесяў), а таксама яек, цытрусавых, клубніц, суніц, рыбы, шакаладу. Калі малое знаходзіцца на грудным кармленні, то дыятэз можа праявіцца як наступства ўжывання гэтых прадуктаў маці, якая корміць. Радзей сып узнікае пры нашэнні адзення, памытага пральным парашком.

— Акрамя сыпу на твары як яшчэ праяўляе сябе хвароба?

— Самымі частымі праявамі дэрматытаў у дзяцей з'яўляюцца пачырваненне, сухасць і лушчэнне шчок. Прычым пачырваненне можа памяншацца або цалкам знікаць пры выхадзе на холад, а пасля зноў выяўляцца. З ранняга ўзросту ў такіх малых могуць адзначацца агульная сухасць скуры, прэласці ў зморшчынах скуры, якія доўга не знікаюць, асабліва ў вобласці пахвіны і ягадзіц. На валасістай частцы галавы фарміруецца «малочная скарыначка», або гнейс (лускавінкі, якія склейваюцца сакрэтам тлушчавых залоз).

Такім дзецям уласцівы таксама «геаграфічны» язык — на ім маецца налёт, скрэслены разнастайнымі лініямі, а таксама зацяжныя кан'юктывіты, рыніты. ВРВІ нярэдка суправаджаецца ў іх абструктыўным сіндромам (праблемы з дыхальнымі шляхамі). Маса цела часта нарастае нераўнамерна.

— Ці можна супрацьстаяць дыятэзу?

— Нават пры нязначных праявах дэрматыту трэба паказаць дзіця ўрачу. Важна прытрымлівацца гіпаалергеннай дыеты — як дзіцяці, так і маці (пры грудным кармленні).

У хатніх умовах неабходна ўвільгатняць скуру спецыяльнымі крэмамі і ласьёнамі (эмалентамі), падчас штодзённых гігіенічных працэдур выкарыстоўваць ваду камфортнай тэмпературы і не дапускаць расцірання ручніком пасля душа.

Смачна есці

Прадукты, якія грэюць

З надыходам халадоў наш арганізм усё менш здавольваецца гароднінай і садавіной і ўсё часцей патрабуе чаго-небудзь «больш істотнага». Жаданне насыціць арганізм у халодную пару года высокакаларыйнай ежай цалкам натуральнае, бо нам патрабуецца больш энергіі для захавання цяпла. У той жа час рухальная актыўнасць многіх з нас падае: дачныя клопаты прыпынены да наступнай вясны, і ў доме мы праводзім больш часу, што небяспечна наборам вагі. Якія ж прадукты дапамогуць змагацца з голадам і холадам без урону для здароўя і фігуры? Пра гэта расказала інструктар-валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.



Найперш уключаем у рацыён **кашы з цэлага зерня**: аўсянка, грэчка, буры рыс, ячныя і кукурузныя крупы, булгур. Яны — выдатная крыніца складаных вугляводаў, якія расшчапляюцца і ператраўляюцца ў нашым страўнікава-кішачным тракце досыць доўга, ствараючы адчуванне сытасці і цяпла.

Не забываем аб **прадуктах, багатых на ёд**: марская рыба і водарасці, грэцкія арэхі, фейхоа, хурма неабходныя для звычайнага функцыянавання шчытападобнай залозы, гармоны якой удзельнічаюць у тэрмарэгуляцыі арганізма.

Суп, калі ён правільна прыгатаваны, добра сагравае і насычае ў дрэннае надвор'е, лёгка засвойваецца, утрымлівае мноства пажыўных рэчываў і вітамінаў.

Мяса — ялавічына, бараніна, свініна — з'яўляецца добрай крыніцай жалеза. У людзей з нізкім утрыманнем гэтага рэчыва могуць мерзнуць рукі і ногі, яны часта адчуваюць стомленасць.

Прадукты, багатыя на калій і магній, а гэта бульба, сухафрукты, арэхі, бабовыя, бананы, неабходны для нармальнага функцыянавання сардэчна-сасудзістай сістэмы і добрага кровазвароту. Памятаем, што менавіта кроў дапамагае пераразмеркаваць цяпло ўнутры арганізма.

Вострыя прыправы. Корань імбіру, гваздзіка, карыца, кары, хрэн, гарчыца, разнастайныя перцы расшыраюць сасуды, паскараюць кровазварот і, як вынік, саграваюць. Аднак людзям з хваробамі страўнікава-кішачнага тракта ўжываць іх трэба з асцярожнасцю, каб не справакаваць абвастрэнне наяўных захворванняў.

Улічыце, што павышаная адчувальнасць да холаду можа сведчыць аб такіх захворваннях, як вегета-сасудзістая дыстанія, анемія, атэрасклероз, гіпатырэоз, цукровы дыябет. У такіх выпадках неабходна пракансультавацца з урачом.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	ПКУП «Жилкомплект», г. Минск, ул. Аннаева, 67
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: оборудование. Местоположение: г. Минск, ул. Аннаева, 67

Лот №	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС, бел. руб.
1.	Комплекс плазменной резки КПР-02 инв. 90080037. Установка плазменной резки HiFocus 130	90080037	52 920,00
2.	Баллоны для азота высокой чистоты (4 шт.)	-	1 296,00
3.	Пресс для сращивания МН1531	440090060	3720,00
4.	Многопильный станок ЦДК 5-3	40010046	3600,00
5.	Заточное устройство для ленточных пил	40010039	504,00
6.	Подающий механизм ПДГ 312-5 УЗ.1	40020040	384,00
7.	Сварочный аппарат ВДГ 303 УЗ	40020041	264,00
8.	Выпрямитель для дуговой сварки ВДГ-303-3 УЗ	40020042	528,00
9.	Подающий механизм ПДГ 312-5 УЗ.1	4002045	384,00
10.	Подающий механизм для ручной сварки ПДГ 312-5 УЗ.1	40020038	384,00
11.	Вытяжной механизм	40020065	8160,00
12.	ФСШ-1А станок фрезерный	40010070	1200,00
13.	Гильотина стд-9 2500 мм	40020001	6720,00
14.	Выпрямитель сварочный ВС-300 Б	-	312,00
15.	Шипорезный станок ШО 16-4	-	1320,00
16.	Станок вертикальный сверлильно-пазовальный, мод. «СВА-3»	-	2280,00
17.	Кромкооблицовочный станок jaroma	40010010	6360,00
18.	Шипорез МХ3516	40010058	6240,00
19.	8-тонный чиллер с водяным охлаждением	40020075	4080,00
20.	Стружкоотсос УВП-3000С	40010078	804,00
21.	Универсально-заточной станок 3в 642	40020260	1680,00
22.	Пресс для скрепления деревянных конструкций	40010050	3960,00
23.	Стружкоотсос УВП-2000С	40010080	396,00
24.	Грузовая тележка	60010002	3240,00
25.	Фильтр рукавный фрдм-4-3,15	40010075	348,00
26.	Станок вертикально сверлильный	40010013	756,00
27.	Выпрямитель для дуговой сварки ВДГ-303-3 УЗ	40020043	528,00
28.	Подающий механизм для дуговой сварки ПДГ-312-5 УЗ.1	40020046	384,00
29.	Станок верт. свер. 2М135	40020009	2160,00
30.	Стол	40010038	44,40
31.	Точильно шлифовальный станок 3М633	40030051	396,00
32.	Пресс кромкообрубной	40020030	2880,00
33.	Станок точильно-шлифовальный 3б632	-	816,00
34.	Стенд для расточки тормозных барабанов Р-185	40030049	7440,00
35.	Трубогибочный станок	-	5640,00
36.	Станок ВФ-57 фрезерный вертикальный консольный	40020059	6720,00
37.	Гильотинные ножницы Н3121	40020053	5400,00
38.	Гильотинные ножницы Н3121	-	5400,00
39.	Станок верт. свер. 2Н135	40020049	2280,00
40.	Станок верт. свер. 2Н135	-	2280,00
41.	Станок токарно-винторезный модели МК6056	40020017	13320,00
42.	Токарный станок «Кусон-3»	40020016	4440,00
43.	Сварочный полуавтомат А10МТВ-44	-	240,00
44.	Сварочный аппарат ВА-350.1	40020032	996,00
45.	Аппарат плазменной резки РС 105	40020047	1920,00
46.	Установка точечной и контактной сварки	40020056	2640,00
47.	Установка компрессорная Remeza	-	11040,00
48.	Полуавтомат сварочный Magster-351 W с механизмом подачи сварочной проволки PDE 41 W	-	2760,00
49.	Токарный станок тв 320	40020057	2160,00
50.	Подающий механизм для дуговой сварки ПДГ-312-5 УЗ.1	-	420,00
51.	Кран-балка	40010024 (склад)	16920,00
52.	Кран-балка 2 т	-	10800,00
53.	Заточной ТЧПА-7	40010011	1800,00
54.	Пилорама Р63-4Б	40010006	5760,00
55.	Кран-балка	40010024 (пилорама)	7800,00
56.	Пилорама Р63-4Б	40010007	5760,00
57.	Кран-балка	-	2520,00
58.	Оконный центр COLOMBO AM-33	40010057	7800,00

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 29.11.2024.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок:
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **28.11.2024** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) и Минского городского исполнительного комитета (https://minsk.gov.by/) 14.11.2024 г.

